

МЯЖА ЦЯРПЕННЯ

6

ІТАЛЬЯНСКАЯ МАФІЯ І КАРАНАВІРУС

11




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 КРАСАВІКА 2020 г. СУБОТА № 66 (29180)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Маладому чалавеку заўсёды цяжка знайсці першае рабочае месца, і сусветны вопыт гэта пацвярджае. У Заходняй Еўропе, напрыклад, узровень беспрацоўя сярод моладзі дасягае 20-25 %. Дзякуючы наяўнай у Беларусі сістэме гарантый па даванні першага рабочага месца ўдалося пазбегнуць напружання на рынку працы ў гэтым сегменце. Па выніках 2019 года ўзровень беспрацоўя сярод моладзі ў Беларусі складае 6,6 % і апошнія пяць гадоў пастаянна зніжаецца».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Што трэба рабіць, мы ведаем»

Падчас рабочай паездкі ў Смалявіцкі раён Прэзідэнт выказаўся аб надзённых пытаннях у сельскай гаспадарцы і сітуацыі вакол пандэміі каранавіруса

**Для кагосьці пятніца праходзіць у запаволеным рабочым рытме, у прадчуванні будучых выхадных. Для Прэзідэнта Беларусі гэты дзень, наадварот, — адзін з самых напружаных на тыдні. Некалькі пятніц запар ён праводзіць у камандзіроўках. Учора яго маршрут пралягаў на Смалявіцкі раён. Там яго чакалі на мяса-малочнай ферме філіяла «Смалявічы Дэйрыз» ААТ «Смалявічы Бройлер» і на прадпрыемстве па вытворчасці мяса-каўбасных вырабаў ЗАТ «Юніміт».**



Фота БелТА.

## НОУ-ХАУ АЙЧЫННАЙ «МАЛОЧКІ»

Група кампаній "Сервалюкс", прадпрыемства якой наведаў Прэзідэнт, — адзін з найбуйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ў краіне. На рахунку іх экспарту 114 тысяч тон мяса птушкі, 3,5 тысячы тон камбікармоў, 4 тысячы тон малочнай прадукцыі. Аб'ёмы вытворчасці дазволілі не толькі забяспечыць рабочымі месцамі больш за 9600 чалавек, але і гарантаваць ім годныя заробкі. У 2019 годзе сярэднямесячная заработная плата склала 1330 рублёў.

СТАР. 2

# Мастакі дарог



З красавіка ў сталіцы пачынаецца сезон нанясення разметак на праезных участках вуліц і праспектаў. Нягледзячы на няспынны аўтамабільны рух, спецыялісты Спецыялізаванага мантажна-эксплуатацыйнага прадпрыемства Мінгарвыканкама наносяць лініі і стрэлкі для кіроўцаў, абазначаюць пераходы для пешаходаў. Шафёр і маляр у адной асобе Міхаіл БУРАК *(на фота справа)* са сваім памочнікам Аляксеем ВЕРНІКОВІЧАМ гэтымі днямі працуюць на Партызанскім праспекце, а дакладней на скрыжаванні праспекта з завулкам Рабочым. На ўзбраенні брыгады — сучасная ўстаноўка «Контур», з дапамогай якой фарба лёгка наносіцца на асфальтавае пакрыццё.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

КОРАТКА

- **Міністэрства аховы здароўя ўстанавіла правілы паводзін у самаізаляцыі людзей, якія прыбылі з-за мяжы.**
- Кітай накіруе ў Беларусь яшчэ тры самалёты з медыцынскай гуманітарнай дапамогай.
- **ФПБ пачаў штотыднёвы маніторынг цэн на сацыяльна значныя тавары. Усталяваны парог росту кошту — не больш за 0,5 % у месяц.**
- У Італіі памёр вядомы дызайнер жаночага абутку Серджыа Росі.



- **У «Белнафтахіме» пацвердзілі пастаўкі нафты на НПЗ у красавіку ў аб'ёме 2 мільёна тон.**
- Прапановы па плане падрыхтоўкі законапраектаў на 2021 год можна ўнесці да 4 мая.

ISSN 1990 - 763X

Спецыяльны рэпартаж

# «Рэальнае жыццё ні ў які нават самы дасканалы закон не ўмесціш»

Пра першы год жыцця Вярхоўнага суда ў новым будынку расказаў першы намеснік яго старшыні Валерый КАЛІНКОВІЧ

**Увагу на новы дом Вярхоўнага суда, праязджаючы па вуліцы Арлоўскай, звяртае, бадай, кожны. Манументальны шкляны будынак, абрамлены з боку нацыянальным арнаментам, у сонечныя дні быццамззяе. Ды і ўвогуле раён асаблівы: насупраць — Палац Незалежнасці, абноўлены выставачны комплекс («Рамонак») і Плошча Дзяржаўнага сцяга. Дызайнерскія рашэнні для Вярхоўнага суда заслугоўваюць увагі. Экскурсіі туды водзяць не так часта, але пятага красавіка будынак будзе святкаваць першы год з адкрыцця, і з гэтай нагоды менавіта для чытачоў «Звязды» зрабілі выключэнне. «Гідам» выступіў першы намеснік старшыні Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь Валерый Калінковіч, які кантраляваў усе этапы будаўніцтва і памятае дом правасуддзя яшчэ пустой бетоннай каробкай.**

СТАР. 5

# «Што трэба рабіць, мы ведаем»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Смалявічы Дэйрыз», дзе сустракалі Аляксандра Лукашэнку раніцай пятніцы, — гэта філіял ААТ «Смалявічы Бройлер», якое мае жывёлагадоўчы кірунак. Па ўзгадненні з Прэзідэнтам група кампаній сем гадоў таму набыла 99 працэнтаў акцый таварыства.

Асноўны рынак экспарту для прадпрыемства — Расія, працуюць і на Кітай. Прэзідэнт пахваліў імкненне развіваць на міжнародным рынку, укараняць новыя тэхналогіі. Кіраўнік групы кампаній Яўген Баскін расказаў пра вытворчы ланцужок, магчымасці вытворчасці.

«З першага дня работы мы ўзялі курс на тое, каб быць больш эфектыўнымі за нашых канкурэнтаў за кошт культуры вытворчасці і айчынных рэвалюцыйных распрацовак», — сказаў Яўген Баскін.

Прадпрымальнік пахваліўся фінансавай устойлівасцю, прыбытковасцю, высокай ацэнкай фермерскай гаспадаркі замежнымі спецыялістамі і ноу-хау.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ўлада заўсёды будзе падтрымліваць арганізацыі, якія клапоцяцца аб людзях. «***Галоўнае — гэта чалавек,*** — падкрэсліў Прэзідэнт. — ***Калі ты не будзеш глядзець на людзей сёння, то жыццё тваё тут нядоўгае. Калі людзі будуць задаволены сваёй работай, і малако, і мяса будзе. Тэхналогіі знойдзем***».



Фота БелТА.

На прадпрыемстве «Юніміт».

## ГРЭЧКІ ХОПІЦЬ НА ЎСІХ

Перад пачаткам знаёмства з вытворчасцю Прэзідэнт заслухаў даклады аб развіцці рэгіёна і вобласці і ходзе пасяўной у краіне.

Азімымі сёлета засеяна 1 мільён 880 тысяч гектараў, плошчы выраслі на 180 тысяч гектараў. Стан культур здавальняючы. Што датычыцца яравых, то іх сяўба будзе забяспечана на плошчы 2 мільёны 616 тысяч гектараў.

Усе вобласці краіны прыступілі да сяўбы ранніх яравых збожжавых.

Каб захаваць аптымальныя тэрміны, неабходна на працягу 10 дзён пасеяць раннія яравыя культуры. Фактычна завяршыла яравую сяўбу Гомельская вобласць, заканчвае Брэсцкая. Мінская, Магілёўская і Гродзенская вобласці справяцца з задачай цягам тыдня.

Больш дзён спатрэбіцца Віцебшчыне. Прэзідэнт параіў распрацаваць для рэгіёна стратэгію па засяванні плошчаў: «Мы дамовіліся ў Віцебскай вобласці вырошчваць тыя культуры, якія там растуць. Калі там збожжавыя не растуць і кукуруза на зерне, то навошта там іх высяваць?»

Аграрыі цалкам забяспечаны палівам. Па словах Прэзідэнта, за гэта трэба дзякаваць у тым ліку і сітуацыі на рынку — нафта амаль нічога не каштуе. Аляксандр Лукашэнка загадаў запоўніць нафтапрадуктамі сховішчы ў раёнах і абласцях.

«Па вашым даручэнні, каб забяспечыць спажыванне краінай грэчкі, мы яе высяваем 22,8 тысячы (гектараў — **«Зв.»**) і павялічваем яе сеў на 187 працэнтаў. Насенне ў краіне ёсць», — паведаміў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван КРУПКО.** Краіна забяспечвала сябе грэчкай на 50 працэнтаў, другую палову ад патрэбы закуплялі ў Расіі, дзе больш спрыяльныя ўмовы для яе вырошчвання.

«Трэба вырошчваць грэчку, якая б ні была ў нас тут ураджайнасць. Трэба падабраць адпаведныя глебы, вывучыць добра гэту культуру», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Ухваліў кіраўнік краіны жаданне аграрыяў павялічыць вытворчасць агароднінны, у тым ліку бульбы.

«Нядобра, што некаторыя гаспадаркі атрымліваюць па 900 цэнтнераў бульбы, а некаторыя — 150, як у савецкія часы. Таму трэба там, дзе ёсць школа, там, дзе захаванне тэхналогій, дзе навучыліся гэта рабіць, дадаць плошчы або на тых жа плошчах інтэнсіфікавацца», — даручыў лідар краіны і пацікавіўся станам цяплічных гаспадарак. Яму паведамілі, што гаспадаркі забяспечваюць унутраны рынак агароднінай. Некаторыя культуры (напрыклад, таматы) экспартуюцца ў Расію.

«Разам з лясной гаспадаркай сельская гаспадарка — гэта прырытэт. Гэта наша», — сказаў кіраўнік краіны і заўважыў, што на фоне пандэміі каранавіруса Еўропа ўжо загаварыла пра магчымы голад. Таму беларускія сельгасвытворцы могуць пастарацца, каб забяспечыць нішу.

Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын папрасіў падтрымкі ў развіцці арганічнага земляробства ў фермерскіх гаспадарках і часткова субсідзіравання будаўніцтва комплексаў для жывёлагадоўлі. Першую ідэю кіраўнік краіны падтрымаў, наконт другой заўважыў: «Мне патрэбныя канкрэтныя аб'екты, якія будуць будавацца, і канкрэтныя сумы, і тэрміны... Давайце паспрабуем на Мінскай вобласці. Толькі каб не атрымалася, як часам бывае: мы выдатны комплекс пабудавалі, а там у каровы ўдой, як ад казы».

Яшчэ адзін пункт на карце Смалявіччыны, дзе чакалі Прэзідэнта, — ЗАТ «Юніміт». Год таму на яго месцы быў убойны цэх Смалявіцкай бройлернай птушкафабрыкі. Інвестыцыі, падтрымка партнёраў — і стары цэх ператварыўся ў высокатэхналагічны мясаперапрацоўчы комплекс, з якім пазнаёмілі кіраўніка краіны.

* * *

**Завяршыўся візіт у Смалявіцкі раён размовай Прэзідэнта з журналістамі. Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні, якія (і гэта прадказальна) так ці інакш закранаюць тэму барацьбы з каранавірусам. Панікі няма, але ўмовы сапраўды складаныя, пагадзіўся беларускі лідар.**

## Канікулы могуць працягнуць

Першае пытанне ад журналістаў напрыканцы школьных канікул — пра прапанову некаторых бацькоў іх працягнуць з-за неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкі.

«Я ў гэтай сітуацыі сам знаходжуся як бацька. І я лічу, што патрабаванні падоўжыць канікулы з боку бацькоў, медыцыны — гэта няправільна. Але некалі я сказаў, што мы не будзем ціснуць на бацькоў. Гэта іх дзеці, іх жыццё. І як яны прымуць рашэнне ў гэтым каранапсіхозе, так і будзе. Таму я катэгарычна супраць, я не згодны, што трэба дзіця выключыць з дзіцячага садка ці школы, падоўжыўшы канікулы. ***Але калі паабяцаць, што будзе так, як просяць бацькі, так і будзе»,*** — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў тэндэнцыю, што яшчэ да пачатку канікул класы заставаліся напалову пустыя. «Думаю, заўтра-паслязаўтра мною будзе прынятае адпаведнае рашэнне. ***Хутчэй за ўсё мы працягнем на адзін тыдзень канікулы. Выключна таму, што гэтага хочуць бацькі*** і не ўсе адпускаюць дзяцей у школу ў гэты час», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Навучанне не будзе падоўжана летам, таму што ў праграмах ёсць запасны тыдзень.

## «Падтрымаем тых, хто ўкладзецца сам»

Пацікавіліся журналісты, якія Прэзідэнт бачыць магчымыя інструменты падтрымкі пэўных галін і прадпрыемстваў ва ўмовах пандэміі.

«Кіраўнік прадпрыемства (Яўген Баскін. — **«Зв.»**) не папрасіў жа мяне аб нейкай падтрымцы. Таму што ён працуе, — адказаў на гэта кіраўнік дзяржавы. — І на яго добрую прадукцыю ёсць попыт. Калі ласка: працуйце і зарабляйце». Прэзідэнт параіў арыентавацца на замежных рэстаратараў, якія, каб захаваць бізнес, пачалі развозіць ежу па дамах — рэнтабельнасць добрая. Што да беларускага авіяперавозчыка, якога сітуацыя пазбавіла магчымасці зарабляць, бо ў свеце закрыліся аэрапорты, то дзяржава яго падтрымае. «Дарэчы, амерыканцы і з нашай дапамогай вывозяць сваіх людзей з поўдня праз наш аэрапорт туды, на Стакгольм, на Брусель — і да Амерыкі мы ім прапанавалі свае паслугі і самалёты. Таму што ў нас добрыя новыя самалёты, калі ласка, можам перакідваць (людзей. — **«Зв.»**). І яны там удзячныя за гэта. Наколькі можам, шукаем работу ўсюды», — паведаміў беларускі лідар, заўважыўшы, што сітуацыя, якая склалася, — «гэта не віна авіяперавозчыкаў».

***Аляксандр Лукашэнка згадзіўся: складана ўсім, нават гігантам кшталту БелАЗа.*** «Ні кар'еры, нідзе нічога не працуе, і тое яны па адной штуцы стараюцца прадаваць. Але там тысячы людзей. Жодзіна трымаецца на БелАЗе. ***Як вы думаеце, вы рэстаран сёння будзеце падтрымліваць ці БелАЗ? Канешне, вытворцу»,*** — абазначыў прыярытэты Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што размова не ідзе пра прынцып: «ратаванне тых, хто тоне, у іх уласных руках».

«***Але настаў час скарбонку развязаць, укласці ў бізнес тыя запасы, якія ў цябе ёсць,*** бо ты толькі што з Гаа прыехаў, з Балі, з Егіпта — грошы на гэта ты знайшоў. Цяпер ачухайся, у дзяржавы прыйшоў прасіць грошы з бюджэту для падтрымкі бізнесу. ***Падтрымаем. Падтрымаем тых, хто хоча, каб яго падтрымалі, і другое — таго, хто ўкладзецца сам.*** А калі ён склаў рукі, дзесьці ў афшорах у яго там грошы нейкія, і думае, што яму мы забяспечым яго светлую будучыню, хай нават не разлічвае», — абазначыў падыходы Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: ***кожны павінен сам адказваць за свой бізнес, а дзяржава падставіць плячо, калі будзе магчымасць.*** Менавіта для гэтага кіраўнік дзяржавы даручыў ураду, Камітэту дзяржкантролю, Адміністрацыі Прэзідэнта падрыхтаваць прапановы па падтрымцы розных сектараў эканомікі ў выпадку неабходнасці. Цяпер комплекс мер разглядаецца з улікам гэтага патрабавання.

«Вось формула: думай перш за ўсё ты за свой бізнес, а потым прыходзь да дзяржавы. Пакуль трэба спадзявацца на сябе — вось як бы непапулярна гэта ні гучала. А падтрымку... Усім, каму трэба, па меры магчымасці, сумленна і справядліва мы акажам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## Не франтам, а кропкава

Растлумачыў Аляксандр Лукашэнка і чаму Беларусь не адмяняе масавыя спартыўныя мерапрыемствы. Ён нагадаў, што цяпер у краіне завяршаецца хакейны турнір і застаецца толькі футбольны. Першае, на што звярнуў увагу Прэзідэнт, — гледачоў туды не «заганяюць», толькі прапаноўваюць ахвотным.

«У суботу мы гулялі ў аматарскай лізе — там усяго каля тысячы чалавек можна размясціць, ну, чалавек васемсот іх было. Група была ваенных, МНС-нікаў, МВД. Асобна пасадзілі іх — яны ўсё роўна тусуюцца і труцца адзін аб аднаго ў гэтых казармах», — расказаў кіраўнік дзяржавы. Ён даручаў кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Ігару Сергеенку паназіраць за станам здароўя гледачоў суботняга матча — ніякіх праблем не выяўлена.

«А чаго мы будзем забараняць? Гэта ўвогуле не наш падыход і не наша канцэпцыя. Гэта не таму, што мы бравіруем чымсьці, справа нават не ў каранавірусе. Гаворка ідзе пра тое, што мы пераадольваем пік сезонных захворванняў. Дзякуй богу, што ў нас падзенне і смяротнасці, і захваральнасці, але мы вышлі на пік. Нам трэба зваліцца з гэтага піка ўніз — і ў гэты час трэба паберагчыся. Мыць рукі, дыхаць свежым паветрам, есці сметанковае масла 20-30 грамаў (доктар адзін расійскі параіў)», — чарговы раз агучыў меры прафілактыкі беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў Беларусі параўнальна невялікая колькасць хворых на каранавірус, у тым ліку тых, хто падключаны да апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх. Кіраўніку дзяржавы шторанак дакладваюць аб стане іх здароўя.

Прэзідэнт заклікаў людзей не панікаваць і падкрэсліў, што ў краіне прымаюцца ўсе неабходныя меры. «***Што трэба рабіць, мы ведаем,*** — заявіў кіраўнік дзяржавы. — ***Тое, што мы робім цяпер, тое і будзем рабіць. Самае галоўнае*** (дарэчы, спецыялісты СААЗ не пярэчаць) — ***трэба не франтам змагацца супраць усяго (забараніць усё і іншае), а ачагова.*** Як я калісьці казаў, кропкава: ***выявілі чалавека — праверылі, каранавірус — лечым***».

У краіне прымаюцца ўсе меры перасцярогі ў аэрапортах, на межах і ў граніцах, калі трэба. Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь забяспечана сродкамі аховы (маскамі, рэспіратарамі, бахіламі), кожная вобласць пачала шыць дадатковыя аб'ёмы і частку прадаваць.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ва ўмовах распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі медыкам належыць не забываць і на «паўсядзённыя» хваробы: анкалагічныя, сардэчна-сасудзістыя, траўмы.

«А так у нас крэн: усе схаваліся за каранавірус. У аўторак я планую нараду — ужо будуць вынікі. Квартал прайшоў, мы ўжо можам параўнаць (дынаміку захворванняў на пнеўманію ў мінулыя гады. — **«Зв.»**). А лічбы — рэч упартая, ад іх нікуды не дзенешся», — запрасіў Прэзідэнт прадстаўнікоў СМІ на нараду.

Як пазней паведаміў журналістам старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Турчын, у прыватнасці, у Мінскай вобласці сёлета назіраецца памяншэнне колькасці хворых, пралечаных і памерлых ад пнеўманіі.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, вярнуліся дамоў спартсмены, якія рыхтаваліся да Алімпіяды, перанесенай праз каранавірус. Алімпійцы вытрымліваюць каранцін, усе здаровыя, падкрэсліў Прэзідэнт.

## Ваенныя медыкі ў дапамогу

Аляксандр Лукашэнка даручыў прыцягнуць ваенных медыкаў да лячэння і прафілактыкі каранавіруса.

«У нас жа там таксама інфекцыяністы ёсць, вірусолагі і іншыя. Трэба іх падключыць: хай яны сваім вокам паглядзяць, як працуюць грамадзянскія медыкі. У нас жа пяць-шэсць такіх бальніц, дзе сканцэнтраваны гэтыя людзі па краіне. Калі трэба, і пракантралююць, і дапамогуць, і самае галоўнае — яны таксама будуць у гэтай тэме, яны навучацца. Што ж мы, думаем, што ў арміі ніколі нічога не здарыцца? А не дай бог, нейкі ваенны канфлікт? Яны першыя пойдуць, таму гэта і для іх пэўная вучоба, і значная дапамога медыкам», — абгрунтаваў Прэзідэнт.

***Пакуль для барацьбы з эпідэміяй няма неабходнасці прыцягваць студэнтаў-медыкаў ці выклікаць пенсіянераў, як у іншых краінах. Так, моладзь і прафсаюзы як валанцёры дапамагаюць старым, але што да лячэння — сіл і сродкаў хапае, запэўніў Прэзідэнт.***

«І ложкі ў запасе ёсць, каля трох тысяч апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх і наркозна-дыхальных — іх у крайнім выпадку таксама можна выкарыстоўваць», — удакладніў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА,**
*г. Смалявічы, Мінская вобласць.*

На слыху

# «Сітуацыя застаецца кантраляванай»


Фота БелТА.

**У Беларусі з моманту выяўлення першага выпадку COVID-19 зарэгістраваны 351 інфіцыраваны. Хворыя ёсць ва ўсіх рэгіёнах. Найбольшая іх колькасць у сталіцы — 190, у Віцебскай вобласці — 89, у Мінскай вобласці — 50, у Гомельскай — 13, Гродзенскай — 6, Магілёўскай — 2, Брэсцкай — 1. Чатыры пажылыя чалавекі з хранічнымі захворваннямі памерлі ад ускладненняў каранавіруснай інфекцыі. Асноўная ўзроставая група інфіцыраваных — ад 25 да 64 гадоў.**

— Сітуацыя ў краіне застаецца кантраляванай. Меры, якія мы прымаем з 20-х чыслаў студзеня, дазволілі прадухіліць, па разліках нашых эпідэміёлагаў, 840 выпадкаў COVID-19 у дзень. Я маю на ўвазе выяўленне пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй, іх шпіталізацыю, а таксама выяўленне кантактаў першага і другога ўзроўню і іх шпіталізацыю і правядзенне супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў на ўсёй тэрыторыі краіны. Калі б не прынятыя меры, мы нічым бы не адрозніваліся ад краін, якія знаходзяцца побач. Ні адна іншая краіна такі пералік мер не прымала: нідзе не шпіталізавалася 100 % кантактаў першага ўзроўню і кантакты другога ўзроўню з сімптомамі вострай рэспіраторнай інфекцыі, — расказала **намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН.**

Яна паведаміла, што цяпер пры тыпіраванні цяжкіх пнеўманій на COVID-19 бяруць не толькі мазок, але і матэрыял з ніжніх дыхальных шляхоў. Таксама на каранавірусную інфекцыю правяраюць усе пнеўманіі сярэдняй цяжкасці. Гэтыя меры накіраваны на тое, каб максімальна выявіць пацыентаў, у якіх каранавірусная пнеўманія.

Намеснік міністра прывяла лічбы па колькасці пнеўманій у краіне. Летась за тры месяцы (студзень — сакавік) іх было зарэгістравана 20 250, у 153 выпадках гэта стала прычынай смерці. Сёлета за тры месяцы ў краіне выяўлена 18 032 пнеўманіі, 128 чалавек ад яе памерла.

На сёння Беларусь мае 10 640 тэстаў на COVID-19, у найбліжэйшыя дні чакаецца пастаўка яшчэ 10 тысяч тэстаў. Акрамя гэтага, праводзяцца выпрабаванні трох тэст-сістэм беларускай вытворчасці і адной экспрэс-сістэмы.

— Для кантролю сітуацыі тэстаў у нас дастаткова, — запэўніла Алена Богдан. — Мы працягваем адсочваць сітуацыю не толькі па каранавіруснай інфекцыі, але і па вострых рэспіраторных інфекцыях і пнеўманіях. Мы прааналізавалі выяўленне каранавіруснай інфекцыі ў кантактаў першага і другога ўзроўню. І з гэтага чацвярга кантакты другога ўзроўню пры наяўнасці ў іх сімптомаў вострай рэспіраторнай інфекцыі абследуюцца на COVID-19 і пры адмоўным тэсце і адсутнасці пагаршэння стану здароўя працягваюць лячэнне на даму. У кантактаў першага ўзроўню, паводле дэталёвага аналізу, інфекцыя выяўляецца на 2-5-ы дзень. Таму на 6-7-я суткі мы выконваем аналіз, і пры атрыманні адмоўнага выніку такога пацыента выпісваюць. Але мы будзем прасіць іх выконваць меры самаізаляцыі яшчэ 14 дзён, — адзначыла Алена Богдан.

Як паведаміў **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК,** Беларусь забяспечана сродкамі аховы:

— З моманту эпідэміі грыпу 2009—2010 года да цяперашняга часу ў нас праз сістэму «Фармацыя» прайшло 750 тысяч масак. З пачатку эпідэміі ва Ухані з нашых аптэк за 10 дзён было літаральна «вымецена» 2 мільёны масак — двухгадовы запас. Таму давялося прымаць экстраныя меры для іх закупкі і наладжвання вытворчасці. Тое ж самае адбываецца з касцюмамі, пальчаткамі і акулярамі.

На сённяшні дзень у наяўнасці ёсць больш за 2 мільёны масак, больш за 90 тысяч рэспіратараў, касцюмаў — звыш 85 тысяч, пальчатак — больш за 10 мільёнаў, ахоўных акуляраў — 24 тысячы. Штодзённы расход гэтых сродкаў сёння такі: касцюмаў — 2100—2200, масак — 300—350 тысяч, рэспіратараў — 2,5-3 тысячы.

На дабрачынным рахунку, адкрытым Міністэрствам аховы здароўя, зараз знаходзіцца 2 875 152 рублі і 28 258 еўра. Мяркуецца, што яны будуць патрачаны на закупку ахоўных сродкаў, у прыватнасці 127 тысяч ахоўных касцюмаў.

Асобна спецыялісты закранулі сітуацыю ў Віцебскай вобласці, дзе на гэтым тыдні працаваў міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік.

— Летась за тры месяцы ў стацыянары пнеўманія была пралечана ў 4258 пацыентаў, 28 памерлі. Сёлета пралечана 3608, у 23 выпадках яна стала прычынай смерці. Мы штодзённа маніторым сітуацыю з COVID-19. За мінулыя суткі ў стацыянар паступіла 25 чалавек, з іх у чатырох аналіз пацвердзіўся, 15 шпіталізаваны як кантакты першага ўзроўню, астатнія — кантакты другога ўзроўню. Выпісана 33 чалавекі. На сёння там шпіталізавана 269 чалавек, з іх 188 кантакты першага ўзроўню, 19 — кантакты другога ўзроўню, — расказала Алена Богдан.

Яна падкрэсліла, што сістэма аховы здароўя працуе на тым жа першым этапе плана, на якім і працавала з самага пачатку. Перапрафіляванне медыцынскіх устаноў не дапускае зніжэння аказання экстраннай і неадкладнай медыцынскай дапамогі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# «Добры тэлефон» — у дапамогу

**Мабільныя аператары life :) і А1 падтрымалі праект «Добры тэлефон», арганізаваны Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа і платформай «Імёны». Іх абаненты могуць бясплатна тэлефанаваць на інфармацыйную лінію для пажылых людзей, якія знаходзяцца ў вымушанай ізаляцыі з-за распаўсюджвання каранавіруса.**

Адзіны кароткі нумар 201 працуе з 30 сакавіка. Яго мэта — дапамагчы пажылым людзям ва ўмовах пандэміі. На інфармацыйнай лініі пазменна дзяжураць валанцёры, адабраныя і навучаныя пры ўдзеле экспертаў Чырвонага Крыжа. Яны змогуць адказаць на хвалюючыя пытанні, падзяліцца інфармацыяй пра тое, куды звярнуцца па неабходную дапамогу, аказаць псіхасацыяльную падтрымку.

Галоўная задача добраахвотнікаў — інфармаваць пажылых людзей пра тое, чаму падчас эпідэміі каранавіруса важна знаходзіцца дома і не наведваць грамадскія месцы, паведаміць, куды можна звярнуцца з просьбай купіць прадукты ці лекі, каб не выходзіць у аптэку або краму. Акрамя таго, аператары інфармацыйнай лініі гатовыя і проста выслухаць сваіх суразмоўнікаў, каб тым было лягчэй перанесці адсутнасць звыклых стасункаў. «Добры тэлефон» па адзіным нумары 201 працуе з 9 да 18 гадзін у будныя дні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# На другі энергаблок АЭС падалі напружанне

**Пачатак падачы напружання па штатнай схеме — ключавая з'ява на этапе стварэння кожнага атамнага блока. Пад напружанне на ўласныя патрэбы была пастаўлена першая секцыя 10 кВ энергаблока № 2 Беларускай АЭС.**

Цягам першых 72 гадзін бесперапыннай тэставай эксплуатацыі спецыялісты правераць працаздольнасць усіх чатырох секцый 10 кВ сістэмы электразабеспячэння нармальнай эксплуатацыі. Пасля пацвярджэння іх адпаведнасці праектным характарыстыкам электраэнергію ад гэтага абсталявання можна будзе падаваць на іншыя аб'екты блока.

— Падключаць энергаблок, які будуецца, да штатнай схемы энергазабеспячэння будзь паэтапна, — растлумачыў **Аляксей КАНАНЕНКА, дырэктар па будаўніцтве Беларускай АЭС ІК «АСЭ».** — Спачатку напружанне атрымаюць сістэмы электразабеспячэння нармальнай эксплуатацыі, затым яго размяркуюць па сістэмах электразабеспячэння каналаў сістэм бяспекі і далей на спажыўцы рэактарнага аддзялення, машынная залы і іншых аб'ектаў.

Забеспячэнне блока электраэнергіяй дазволіць перайсці да поўнамаштабных пусканаладачных работ.

— Правільна спланаваная праграма паэтапнай падачы напружання дасць магчымасць разварнуць пусканаладачныя работы на тэхналагічных сістэмах і абсталяванні і забяспечыць гатоўнасць блока да этапу гідраўлічных выпрабаванняў і цыркуляцыйнай прамывкі, — дадаў **Віталь ПАЛЯНІН, віцэ-прэзідэнт ІК «АСЭ», кіраўнік праекта стварэння Беларускай АЭС.** — Ён запланаваны на канец гэтага года.

**Ірына СІДАРОК.**

Ну і ну!

# Учынілі пагром і скралі веласіпеды

**Раніцай у Шчучынскі РАУС патэлефанавалі з ЖКГ і папрасілі ўстанавіць хуліганаў, якія разграмілі некалькі аб'ектаў райцэнтра. Невядомыя зламалі лаўку і некалькі імянных таблічак заснавальнікаў гарадской алеі, выкінулі ў возера урну, разбілі пражэктары каля пастамента і пашкодзілі сядзенні на пляцоўцы для пляжнага футбола.**

Калі аператыўнікі працавалі на месцы здарэння, у РАУС патэлефанаваў мужчына і расказаў, што ў яго скралі веласіпед. Пазней высветлілася, што абодва злачынствы — справа рук адных і тых жа людзей, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

Як было выяўлена, трое 17-гадовых падлеткаў з Гродна прыехалі да свайго знаёмага. Ноччу госці вырашылі наведаць гарадское возера. Пешшу ісці не захацелі, таму, пакідаючы інтэрнат, забралі чужы веласіпед. На ім даехалі да месца, пасля чаго ўчынілі пагром на двух вуліцах.

Прыгоды на гэтым не скончыліся. Па дарозе ў суседні населены пункт, дзе жыве прыёмная сям'я аднаго з хлопцаў, падазраваныя таксама кралі веласіпеды, якія затым кідалі на шляху руху. Да пасёлка хлопцы так і не дабраліся, з'ехаўшы на спадарожным аўтамабілі ў Гродна.

Дваіх удзельнікаў крымінальнага трыа затрымалі аператыўнікі, месцазнаходжанне яшчэ аднаго пакуль высвятляецца. Са слоў непаўналетніх, яны адважыліся на злачынства дзеля забавы.

Следчыя распачалі крымінальную справу па факце злоснага хуліганства. Праводзіцца праверка па крадзяжах веласіпедаў.

Усе фігуранты вучацца ў адным з гродзенскіх каледжаў і стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Адзін з іх судзімы за маёмасныя злачынствы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі абвясцілі жалобу па ахвярах каранавіруса

Улады Кітая абвясцілі 4 красавіка днём агульнанацыянальнай жалобы па ахвярах эпідэміі каранавіруса. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на мясцовае тэлебачанне. Дзяржсавет КНР прыняў рашэнне аб'явіць 4 красавіка жалобу па ахвярах пандэміі, а таксама медыках, якія ахвяравалі свае жыцці дзеля выратавання людзей. Сёння ў краіне прыспусцяць сцягі, у тым ліку на тэрыторыі замежных дыпмісій. Усе забаўляльныя грамадскія мерапрыемствы адменены. Раней Кітай адказаў на падазрэнні ЗША ў заніжэнні звестак па каранавірусе. Прадстаўнік МЗС КНР Хуа Чун'ін распавяла, што Кітай заўсёды прытрымліваўся адкрытай пазіцыі адносна публікацыі дадзеных аб эпідэміі. «Аўтарытэт у гэтым пытанні застаецца за СААЗ і эпідэміёлагамі, а не палітыканамі», — падкрэсліла дыпламат.

### Пандэмія зацягнецца больш чым на год

Пандэмія каранавіруса можа працягнуцца ад 12 да 18 месяцаў, піша CNN. Пра гэта расказаў дырэктар Гарвардскага інстытута глабальнай аховы здароўя Ашыш Джха. «Гэта не вірус, які сыходзіць праз два тыдні, чатыры тыдні ці шэсць тыдняў. Мы будзем жыць з гэтым у той ці іншай форме на працягу 12—18 месяцаў, калі нам пашанцуе», — адзначыў ён. Паводле слоў дырэктара Гарвардскага інстытута глабальнай аховы здароўя, да з'яўлення вакцыны свет будзе «працягваць змагацца з вірусам».

### Галодная чорная дзірка можа быць звяном эвалюцыі Сусвету



Каманда астраномаў выявіла самыя важкія на сённяшні дзень сведчанні існавання класа чорных дзірак, якія дагэтуль заставаліся няўлоўнымі. Гэты клас лічыцца самым цікавым, таму навукоўцы былі ўражаныя, калі адна з іх выдала сваё існаванне, пачаўшы пажыраць зорку, якая апынулася занадта блізка. Назіраць чорныя дзіркі непасрэдна немагчыма, і навукоўцы робяць высновы аб іх існаванні ўскоснымі метадамі. Гэтыя нябесныя целы сярэдняй масы ў першую чаргу цікавыя тым, што лічацца адсутным звяном у разуменні працэсу эвалюцыі зорак.

В **суд Пуховичского района** поступило заявление государственного учреждения образования «Руденская вспомогательная школа-интернат» о признании гражданки ГЛУХОРОВОЙ Людмилы Мохамедовны, 23.03.1978 года рождения, умершей, уроженки д. Старинки Борисовского района Минской области, последнее известное место жительства: Минская область, Борисовский район, д. Старинки.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данной гражданке, сообщить их суду в течение 2 месяцев со дня публикации объявления.

В **суд Пуховичского района** поступило заявление государственного учреждения образования «Руденская вспомогательная школа-интернат»о признании гражданки БАЖАНОВОЙ Натальи Владимировны, 16.02.1971 года рождения, умершей, уроженки п. Лесогорск Чунского района Иркутской области Российской Федерации, без определенного места жительства. Последнее место пребывания: г. Борисов, ул. Полярная, 29.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данной гражданке, сообщить их суду в течение 2 месяцев со дня публикации объявления.

# ФІЗІЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ ПАТРЭБНА ЗАЎСЁДЫ!

## Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе займацца спортам у хатніх умовах

**У цяперашняй сітуацыі пандэміі, калі многія вымушаны заставацца дома, самаізаляваца або сядзець на каранціне, а ўсё больш фітнес-цэнтраў і трэнажорных залаў прыпыняюць сваю дзейнасць, кожнаму здароваму чалавеку важна падтрымліваць фізічную форму.**

Сядзячы спосаб жыцця і нізкі ўзровень фізічнай актыўнасці могуць аказаць негатыўны ўплыў на здароўе і якасць жыцця, гаворыцца на афіцыйным сайце СААЗ, а таксама выклікаць дадатковы стрэс і паставіць пад пагрозу псіхічнае здароўе грамадзян. Фізічныя практыкаванні і тэхнікі расслаблення дапамогуць захаваць спакой і абараніць здароўе.

СААЗ рэкамендуе 150 хвілін умеранай фізічнай актыўнасці або 75 хвілін інтэнсіўнай фізічнай актыўнасці ў тыдзень. У заяве арганізацыі гаворыцца пра неабходнасць рабіць кароткія актыўныя перапынкі цягам дня. Гэта могуць быць танцы, гульні з дзецьмі альбо, напрыклад, выкананне хатніх спраў, такіх як уборка дома. Таксама СААЗ рэкамендуе скарыстацца анлайн-рэсурсамі, якія прапануюць комплекс фізічных практыкаванняў, — многія з іх знаходзяцца ў бясплатным доступе на YouTube. Для хатніх заняткаў падыдуць уздымы калена да локця, планка, прысяданні, бакавыя ўздымы калена і масток.

Спецыялісты звяртаюць увагу на элементарныя рэчы, напрыклад, такія, як хада: нават у невялікіх памяшканнях хаджэнне па перыметры або марш на месцы можа дапамагчы чалавеку заставацца актыўным. «Калі вам тэлефануюць, стойце ці хадзіце па хаце падчас размовы, а не сядзіце. Калі вы вырашылі выйсці на вуліцу, каб прагуляцца або заняцца спортам, пераканайцеся, што вы знаходзіцеся на адлегласці не менш за 1 метр ад іншых людзей», — гаворыцца на сайце Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

Таксама рэкамендуецца скараціць час, які чалавек праводзіць у сядзячым становішчы, і па магчымасці аддаваць перавагу стаячаму. «У ідэале ў кожны асобны перыяд старайцеся заставацца не больш за 30 хвілін у сядзячым становішчы і становішчы лежачы. Разгледзіце магчымасць выкарыстання стала на высокіх ножках, які дазваляе працаваць у становішчы стоячы, або выкарыстоўвайце ў якасці падставак кнігі ці іншыя прыстасаванні. Падчас адпачынку ў сядзячым становішчы займайцеся разумовымі відамі дзейнасці, такімі як чытанне, настольныя гульні і пазлы», — раяць спецыялісты.

Медытацыя, глыбокія ўдыхі і выдыхі дапамогуць захоўваць спакой.

Для падтрымання аптымальнага стану здароўя таксама важна памятаць аб неабходнасці правільна харчавацца і ўжываць дастатковую колькасць вады.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**




### Скарбы Зямлі

# Прыбываць багаццямі нетраў

**За мінулы год геолагамі краіны быў праведзены вялікі аб'ём работ па выяўленні перспектыўных участкаў для забеспячэння прыросту новых радовішчаў карысных выкапняў. Пра гэта расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль КОЛБ.**

— Першае радовішча базальту было выяўлена ў 2017 годзе ў Пінскім раёне. Да канца гэтага года супрацоўнікі Нацыянальнага практычнага цэнтра па геалогіі падлічаць запасы, чакаем не менш за 10 мільёнаў тон, — паведаміў спікер.

— Частка радовішчаў, якія сканцэнтраваны паблізу паверхні зямлі, ужо адпрацавана, на частцы работы працягваюцца, — дадала **намеснік генеральнага дырэктара па геалогіі Нацыянальнага практычнага цэнтра па геалогіі Галіна КАЧАНКО.** — У асноўным мы арыентуемся на два прадпрыемствы: «Гомельбудматэрыялы», якое выпрабляе цеплаізаляцыйныя пліты з базальтавай сыравіны, а таксама «Полацкшкловалакно», дзе ў хуткім часе пачнецца выпуск супертонкага валакна з яе ж. Але базальт можна выкарыстоўваць нашмат шырэй, бо яго характарыстыкі вельмі добрыя: апроч цеплаізаляцыйнасці, ён устойлівы да эрозій, хімічных уздзеянняў і г. д.

Летась РУП «ВА Беларуснафта» забяспечыла прырост здабычы нафты ў аб'ёме 1,7 мільёна тон. НПЦ па геалогіі таксама атрымаў прырост папярэдне ацэненых запасаў гэтай сыравіны, якія патрабуюць яшчэ больш дэталёвага вывучэння, у аб'ёме 978 тысяч тон. Неабходныя работы былі праведзены і па радовішчы «Наваельскае», якое было разведана ў 2010 годзе. Атрыманы тут прырост запасаў нафты прамысловых катэгорый склаў 646 тысяч тон.

Усе нафтавыя радовішчы краіны звязаны з Прыпяцкім прагібам на поўдні, але на сёння найбольш перспектыўнымі месцамі здабычы вуглевадародаў з'яўляюцца Аршанская і Брэсцкая ўпадзіны. Пра гэта расказаў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў — начальнік упраўлення па геалогіі Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Алег МОХ:**

— Прыпяцкі прагіб — нафтаперспектыўны, але запасы яго не бязмерныя, трэба шукаць новыя напрамкі. Таму цяпер мы знаходзімся на першым этапе вывучэння гэтых упадзін. Праводзяцца сейсмічныя даследаванні, і задача навукоўцаў — абагульніць атрыманыя звесткі і даць заключэнне: ці ёсць перспектыва на нафту.

«Сёлета мы праводзілі работы па разведцы карысных выкапняў за кошт сродкаў заказчыкаў мінеральна-сыравіннай базы для будаўнічай галіны. Ім перадалі восем радовішчаў, у тым ліку два «Беларуснафце» — «Паўночнабярэзінскае» з запасамі нафты 854 тысячы тон і «Шумяцічскае» з 525 тысячамі тон», — сказала Галіна Качанко.

Яна нагадала, што ў краіне з 2016 года вядуцца і рэгіянальныя геалагічныя даследаванні нетраў. Такая работа скіравана не на пошук сыравіны, а на глыбіннае вывучэнне нашай тэрыторыі.

— У прыватнасці, цяпер канцэнтруемся на паўднёваўсходняй частцы. Займаемся пошукам і аналізам даных, для таго каб за наступныя пяць гадоў зрабіць новыя лічбавыя і аналагавыя геалагічныя карты. Прыпаверхневая частка зямлі ўжо амаль вывучана, трэба ісці глыбей. Для гэтага яны і патрэбныя.

У краіне дастаткова востра стаіць пытанне пераходу з ПЭТ-упакоўкі на шкляную тару, таму летась быў забяспечаны добры прырост запасаў кварцавага пяску, прыдатнага для шкляной прамысловасці, — на 5 мільёнаў тон. «Такім чынам, агульныя запасы гэтага карыснага выкапня цяпер у нас складаюць 60 мільёнаў тон, яны ствараюць рэзервы для ўласнай вытворчасці, што дазволіць зменшыць імпарт перш за ўсё з Расіі і Украіны. Сёлета будзе падрыхтавана справаздача аб перспектыўнасці вывучаных плошчаў з кварцавым пяском. Асноўная распрацоўка радовішчаў у краіне вядзецца ў кар'еры «Леніндар» Добрушскага раёна Гомельскай вобласці, а таксама каля вёсак Беражное і Гараднея Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

— Адзначаецца прырост і запасаў будаўнічых матэрыялаў, у прыватнасці будаўнічага каменю, які з'яўляецца для нас адносна новай і вельмі важнай сыравінай, — паведаміў Васіль Колб. — РУВП «Граніт» недалёка ад Мікашэвіч асвойвае новае яго радовішча. Там за мінулы год ужо былі падлічаны запасы ў 142 мільёны тон, гэта забяспечыць нас каменем на 40-45 гадоў.

Нядрэнна ў краіне развіваецца тарфяная галіна. На базе новых радовішчаў ствараюцца вытворчасці, распрацоўваюцца тэхналогіі і прадукцыя. Шырокім попытам карыстаецца тая, што выпускаецца з верхавога торфу. Каля 60-70 працэнтаў яе ідзе на экспарт.

Працягваецца работа па падрыхтоўцы да асваення Нежынскага і Любанскага ўчасткаў Старобінскага радовішча калійных соляў. Тое ж самае датычыцца Петрыкаўскага радовішча па асваенні калійнай руды.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# «СЯБРЫ МАЕ!»

## Шаржы і карыкатуры Алега Карповіча

**І хоць сёння ў часопіса «Вожык» як галоўнага заканадаўцы, кажучы сучаснай мовай, трэндаў у беларускай сатыры, далёка не тыя, «савецкія», тыражы, усе мы любім пажартаваць, пасмяяцца. Не знікаюць розныя сатырычныя, гумарыстычныя жанры, зразумела, не толькі ў «Вожыку», але і на старонках іншых перыядычных выданняў.**

У Дзень смеху, 1 красавіка, адзін з калідораў Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь упрыгожылі карыкатуры і шаржы вядомага мастака Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Алега Карповіча. Тэматычна работы аб'яднаны адным абсягам — мастак прысвяціў зробленае калегам па газетнай, літаратурнай справе. На карыкатурах, шаржах — журналісты «СБ. Беларусь сегодня», «Сельской газеты», іншых перыядычных выданняў. Знайшлося месца і класікам — Якубу Коласу, Янку Купале, славутаму беларускаму першадрукару Францыску Скарыне.

А яшчэ ўсе, хто знаёміцца з выстаўкай, адзначаюць не толькі падабенства з персанажамі, але і шматаблічнасць, якую мастак прыкмеціў у вобразах Людмілы Рублеўскай, Уладзіміра Саламахі, іншых вядомых літаратараў краіны. Асобны шарж сабраў разам і ўсіх галоўных рэдактараў «Вожыка» — Кандрата Крапіву, Уладзіміра Корбана, Юлію Зарэцкую, Валянціна Блакіта, Міхася Пазнякова, Алеся Пісьмянкова...

**Сяргей ШЫЧКО.**

# Гродзеншчына кніжная

**Сённяшняя сітуацыя з каранавірусам не спрыяе масавым мерапрыемствам. Таму замест прэзентацыі «Кніжны свет Беларусі: Гродзеншчына», якая планавалася нашмат раней, у мінскім доме кнігі «Светач» па праспекце Пераможцаў, 11 адкрыта невялікая выстаўка, на якой прэзентуюцца кніжныя здабыткі ў галіне гістарычнага асветніцтва, краіназнаўства, краязнаўства, звязаных з Гроднам і яго ваколіцамі.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

На першым паверсе прасторнай крамы разгорнуты фотавернісаж са здымкаў вядомага фотамастака, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіслава Цыдзіка. Ён — ураджэнец Гродзеншчыны, шмат ездзіць па розных куточках сваёй мілай і любай старонкі. Як вынік — грунтоўныя справаздачы, якія друкуюцца ў перыядычных выданнях, выходзяць альбомамі і кнігамі. Ажыццявіць віртуальнае падарожжа дапамога і выстаўка старых паштовак лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава, творчыя здабыткі якога наміціраваны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Летась У. Ліхадзедаў выдаў сапраўды «гродзенскую калекцыю» альбомаў з серыі «У пошуках страчанага» — кнігі з рэпрадукцыямі філакартычных артэфактаў пра Слонім, Гродна, Навагрудак, Смаргонь.

І самым цэнтральным месцам для знаёмства ў «Светачы» з кніжнай Гродзеншчынай з'яўляецца выстаўка кніг, звязаных з горадам над Нёманам. Асобна вылучаюцца творчыя праекты, якія былі летась падтрыманы Гродзенскім абласным выканаўчым камітэтам. Шмат рупнасці, шмат дзейсных намаганняў дзеля таго, каб гэтыя кнігі пабачылі свет, прыклаў тагачасны намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Лісковіч, цяпер старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. «Кніга спрыяе не толькі духоўнаму развіццю чалавека, але і яго актыўнаму ўдзелу ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны, — перакананы Віктар Лісковіч. — Мы на Гродзеншчыне шмат зрабілі, каб праз кнігу паказаць і гісторыю нашай старонкі, і той багаты турыстычны патэнцыял, які мае наш край, патэнцыял, праз які варта як мага шырэй развіваць эканоміку рэгіёна. Спадзяюся, што вопыт Гродзеншчыны ў галіне сучаснага кніжніцтва будзе пашырацца па ўсёй краіне. Галоўнае — ведаць мэту, дзеля чаго робіцца, здзяйсняецца тое ці іншае выданне».

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# «Рэальнае жыццё ні ў які нават самы дасканалы закон не ўмесціш»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Месца, з якога мы пачалі наш агляд, — зала для пасяджэнняў па грамадзянскіх справах. Яна аснашчана сістэмай аўдыя-, відэафіксацыі, што дазваляе запісваць працэс. Адсюль маё пытанне: **калі ўся судовая сістэма краіны будзе лічбавізавана і чым гэта карысна?**

— *Лічбавізацыя дазволіць адмовіцца ад папяровых пратаколаў. Мы падрыхтавалі адпаведны законапраект, чакаем, што на гэтай сесіі парламента ён будзе прыняты ў другім чытанні. Дзякуючы папраўкам падрабязныя пратаколы заменяць кароткая анатацыя для запісаных файлаў,* — адказвае Валерый Калінковіч.

**— Ведаю таксама, што Вярхоўны суд займаецца стварэннем адкрытай базы даных судовых рашэнняў. Якім чынам тут ідзе праца? Ці не будзе гэта сістэма раскрываць асабістыя звесткі грамадзян?**

— *Чалавек ідзе ў суд вырашаць свае праблемы. Толькі адзінкі зацікаўлены ў тым, каб пра іх ведала ўся краіна. Мы сумесна з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі распрацоўваем рэсурс для фарміравання банка даных судовых рашэнняў, які будзе функцыянаваць з улікам аховы персанальных звестак. Ствараецца камп'ютарны модуль, які заштрыхоўвае ў тэкстах судовых рашэнняў прозвішчы, адрасы і іншую асабістую інфармацыю.*



Рухаемся далей. У некаторых залах пасяджэнняў усталяваны маніторы, якія дазваляюць убачыць, як ідзе працэс у іншых залах. Тэхніка таксама дае магчымасць устанавіць відэамасты з іншымі судамі, юрыстамі. Такая сувязь асабліва актуальная ў цяперашні час самаізаляцыі.

Такім чынам праводзіўся і Прэзідыум Вярхоўнага суда, падрыхтоўка да якога супала з нашай экскурсіяй — намеснік старшыні заадно праверыў якасць сігналу відэасувязі з прадстаўнікамі абласцей.

Далей азнаёміліся з залай пасяджэнняў па крымінальных справах. Там, акрамя прывычных сталоў і крэслаў, усталявана кабіна для абвінавачаных з асаблівага шкла, якое можа вытрымаць кулю пісталета. Сведкі чакаюць, пакуль іх выклічуць для дачы паказанняў, у спецыяльным пакоі з двайнымі дзвярыма. Яны забяспечваюць выкананне правіла, паводле якога дапытаны сведка не можа кантактаваць з недапытаным.

— *Праблема сёння — так званы стрым з суда, які, на жаль, пакуль не забаронены законам. Сведка, седзячы тут, можа з мабільнага тэлефона глядзець справаздачу, што адбываецца ў зале. Такія рэчы перашкаджаюць правасуддзю,* — лічыць Валерый Леанідавіч.





Паказалі нам і кабінет суддзі. Усяго ў Вярхоўным судзе іх працуе 64. У кожнага асабісты пакой. Завіталі мы да суддзі калегіі па крымінальных справах Наталлі Сурмы. Стол, камп'ютар, шафа... Што гэта кабінет суддзі, выдаюць папка з надпісам «Справа №» на стале, сцяг ды герб. Пытаюся: як абжыліся ў новым будынку?

— *Вельмі камфортна, утульна,* — адказвае суддзя.

На другім паверсе выходзім у фае з канапамі і невялікім зімовым садам з відам на вуліцу Арлоўскую і Палац Незалежнасці. Дарэчы, будынкі яднае не толькі вуліца, на якой яны размешчаныя, але і агульны архітэктар — Уладзімір Архангельскі.

Асабліва ўразіла мяне зала пасяджэнняў Пленума — вітражнае шкло на столі, арнаменты на сценах, выразаныя ў дрэве гербы абласцей.

**— А кажуць, у вас ёсць сакрэтны падвал?** — задаю пытанне Валерыю Леанідавічу.

— *Сакрэтны?* — засмяяўся суразмоўца. — *Нічога сакрэтнага там няма. Гэта ізалятар для абвінавачаных. Пусціць туды не магу, бо ключы ад гэтага памяшкання аддалі канвою. Чужыя толькі з яго дазволу туды могуць трапіць. Там 24 адзіночныя камеры для ўтрымання абвінавачаных, якіх прывезлі на суд. Дарэчы, для іх прадугледжана і асобная лесвіца для праходу ў залу.*

Наступны пункт экскурсіі — кавярня. Ежа, праўда, прывазная. Магутнасці дазваляюць і самім гатаваць, але выгадней выходзіць заказваць.

**— Калі ўзводзілі новы будынак, многія асуджалі яго за раскошу...** — выказваю Валерыю Калінковічу адно з меркаванняў.

— *Вядома, у абласных судах у нас такіх люстраў і фантанаў няма, але гэты будынак — сімвал усёй галіны судовай улады. Элементы раскошы — толькі пры ўваходзе ў фае. Вы бачылі кабінеты суддзяў, там нічога лішняга.*

Пабывалі мы і ў музеі. Пакуль ён дастаткова сціплы. Яго «іскрынкі» — канешне, сімвалічны ключ, які ўручалі пры адкрыцці будынка, і галерэя партрэтаў былых кіраўнікоў Вярхоўнага суда з часоў БССР, а таксама асабістая справа Марыі Осіпавай — падпольшчыцы, якая ўдзельнічала ў аперацыі па знішчэнні гаўляйтара Кубэ падчас Вялікай Айчыннай вайны. Марыя Осіпава была суддзёй Вярхоўнага Суда БССР.

Падчас экскурсіі давялося крыху паразмаўляць і пра асаблівасці штодзённай работы суддзяў. Па словах Валерыя Калінковіча, праца суддзі не рэгламентавана часам, бо заўсёды — нават на выходных і ў святы — галава працуе над складанай прававой сітуацыяй.

Вярхоўны суд ажыццяўляе шмат задач, асноўныя з якіх — нагляд і забеспячэнне дзейнасці агульных судоў, разгляд спраў у апеляцыйным, касацыйным парадку. Часам Вярхоўны суд выступае ў якасці суда першай інстанцыі — па шэрагу эканамічных спрэчак, спраў, звязаных з выбарчай дзейнасцю, крымінальных злачынстваў з удзелам вышэйшых службовых асоб. Вярхоўны суд таксама можа ўзяцца за любую справу, якая мае шырокі грамадскі рэзананс. Прыклад таму — суд над Андрэем Уцюрыным, былым першым намеснікам дзяржсакратара Саўбеза. Што датычыцца спраў з вышэйшай мерай пакарання, яны не адносяцца да прамой падсуднасці Вярхоўнага суда. Іх разглядаюць абласныя суды, Вярхоўны суд можа быць задзейнічаны ў іх у якасці апеляцыйнай інстанцыі. Штодня ў Вярхоўным судзе разглядаецца каля 20 эканамічных спраў, каля пяці спрэчак, звязаных з інтэлектуальнай уласнасцю. Па крымінальных справах на першага красавіка значыліся дзве справы па першай інстанцыі — аб карупцыі ў банкаўскай сферы і справа ў дачыненні былога старшыні аднаго з раённых судоў.





**— Наколькі псіхалагічна цяжка суддзі выносіць прыгаворы, разумеючы, што вырашаецца лёс чалавека?**

— *Практычна ўся судовая дзейнасць штодзённа звязана з чалавечымі лёсамі. Мы вырашаем іх кожны дзень. Чамусьці вырашэнне лёсу звязваюць з крымінальнай справай — турма, расстрэл, не дай Бог. А калі мы разглядаем жыллёвую спрэчку, дзе каму жыць, — гэта што, не лёс чалавека? А калі два былыя сужэнцы, бацькі не могуць вызначыцца, як ім выхоўваць дзяцей, — гэта што, не лёс?*

**— Якімі якасцямі павінен валодаць суддзя?**

— *Асноўная — адчуванне справядлівасці. Рэальнае жыццё ні ў які нават самы дасканалы закон не ўмесціш. Заўсёды ўзнікаюць сітуацыі, якія ў рамках закона можна вырашыць тым ці іншым спосабам. І сваім рашэннем суддзя вызначае шлях чалавека на многія гады наперад. Гэта складаныя выпадкі, і журналістам пісаць пра іх складана. У нас асвятленне судовых спраў раскладваецца па дзвюх паліцах — ці ўсё дрэнна — ці ўсё добра, ці ўсіх саджаць — ці ўсіх адпускаць.*

**— А вы чытаеце каментарыі пад публікацыямі пра судовыя працэсы?**

— *Вядома, чытаю, мне і мае сябры, родныя выказваюць гэтыя каментарыі без інтэрнэту. Напрыклад, асудзілі чалавека на доўгі тэрмін за забойства. А мой сябар кажа: ты што, за такое расстрэльваць трэба! Пытаю: а ты б змог падпісаць смяротны прысуд? Адказвае: не ведаю. Адна справа казаць, іншая — самому прымаць рашэнні. Са сваёй канапы ў нас усе юрысты, эксперты і публіцысты. А калі чалавек садзіцца ў залу ў якасці, напрыклад, народнага наглядальніка, успрыняцце адразу змяняецца.*

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# Дзе пралягае мяжа цярпення?

## Роздум пра вынікі сямейнага гвалту і ступень вінаватасці дзеючых асоб

**Неяк адразу зачапілі гэтыя дзве гісторыі. Можа, таму, што адбыліся прыблізна ў адным месцы і ў адзін час. Дакладней, сямейныя драмы здарыліся ў адным раёне з інтэрвалам недзе тры месяцы. А вось прысуд па першай справе амаль супаў па часе са здзяйсненнем другога злачынства. Кожную з гісторый аб'ядноўвае шматгадовы гвалт у дачыненні да жанчыны з боку мужа, цяжкія наступствы і... пытанне, якое не просіцца, а гучна крычыць: «Навошта цярпела? Дзе тая мяжа цярпення, пасля якой трэба было сысці, ды аказалася позна?»**

### ГІСТОРЫЯ ПЕРШАЯ

Таццяна, назавём яе так, жыла з былым мужам пад адным дахам. Мабыць, у пачатку іх сямейнага жыцця ўсё было добра, але дакладна нядоўга. Васіль прызвычаіўся да гарэлкі паступова, а потым п'янка выцесніла ўвесь астатні змест жыцця. І чым больш заўзятым алкаголікам станавіўся, тым больш агрэсіўна сябе паводзіў. У нейкі момант яна не вытрымала і падала на развод. Але пасля разводу нічога не змянілася. Тады Таццяна прапанавала былому пераехаць у вясковы дом з печкай і без зручнасцяў. Ён спачатку падтрымаў ідэю, але ж там ніхто не прынясе паесці і не дасць выпіць задарма. Хутка вярнуўся на законныя квадратныя метры ў горадзе, дзе зноў адчуў сябе гаспадаром.

Для яе пачаўся новы этап хаджэння па пакутах. Фармальна былы муж ёй — сусед, але патрабаваў, каб на стале быў гарачы абед, амаль сілком забіраў грошы на выпіўку і распускаў рукі, як толькі нешта не задавальняла. Чалавек даўно нідзе не працаваў, ды і наогул чалавечае аблічча страціў. Яна некалькі разоў выклікала міліцыю, яго забіралі, складалі пратакол, а калі праспіцца, выпускалі. Тры гады таму, праўда, дайшло да суда. Яму вынеслі прысуд на абмежаванне волі без накіравання ў папраўчую ўстанову. Гэта значыць, ён вярнуўся дадому, каб піць і буяніць далей.

Бяда здарылася ў канцы восені мінулага года. Ён прыйшоў дадому п'яны, адчыніў халадзільнік і пачаў наразаць каўбасу. Яна ўвайшла ў кухню і, мабыць, зрабіла заўвагу, а можа, проста паглядзела з пагардай або нянавісцю. І ён кінуўся з нажом на яе. Удар прыйшоўся ў нагу, лязо нажа перарэзала артэрыю. Кроў хлынула фантанам, яна спрабавала перавязаць сябе, спыніць кроў, прасіла, каб выклікаў хуткую дапамогу. Але ён адабраў яе мабільны, выдраў з разеткі стацыянарны тэлефон, забраў ключы ад уваходных дзвярэй, зачыніў яе і пайшоў.

Жанчына, трацячы апошнія сілы, пераціснула нагу поясам ад халата, дацягнулася да разеткі, уключыла тэлефон і пазваніла на «103», потым адчыніла акно і страціла прытомнасць. Добра, што жыве ў прыватным доме на першым паверсе. Медыкі з брыгады «хуткай» залазілі да яе праз вакно. Знайшлі без пульсу на падлозе, залітай крывёю. Завезлі ў рэанімацыю, выклікалі з Брэста сасудзістага хірурга, правялі аперацыю. Нажом былі пашкоджаны не толькі мышцы і артэрыя, але і нервовыя канчаткі. Шанцаў выжыць было не так і шмат. Выратавала, што брыгада прыбыла вельмі хутка, што першую рэанімацыю правялі на месцы, што ўрачы наогул здзейснілі цуд.

Ён асабліва не раскайваўся, не падаў у ногі перад былой жонкай. Знаходзячыся ў СІЗА, пісаў запіскі з патрабаваннем перадач, а да суддзяў звярнуўся з прапановай прызначыць яму «хімію». Ён быў упэўнены, што волі пазбаўляць не будуць, раней жа вынасілі прысуд аб абмежаванні волі. А яна нават адмовілася ад іску аб кампенсацыях, толькі ўздыхнула свабодна. Ён атрымаў шэсць гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

### ГІСТОРЫЯ ДРУГАЯ

Бяда, што здарылася ў невялікім гарадку раённага падпарадкавання, ускалыхнула гэтае па сутнасці мястэчка. Учарашні школьнік, 17-гадовы навучэнец прафесійнага каледжа, ударыў бацьку сякерай па галаве. Мужчына аказаўся ў рэанімацыі. А сям'ю раней лічылі ледзь не ўзорнай. І толькі вельмі блізкія людзі ведалі, што гадамі і дзесяцігоддзямі там адбываўся не вельмі гучны кашмар.

Маці гэтага сямейства, спакойная і памяркоўная жанчына, працуе ў краме, яе муж працаваў на будоўлі ў Брэсце. Сын добра вучыўся, яму толькі крыху не хапіла для паступлення на бюджэт ва ўніверсітэце. І хлопец, каб не губляць год, пайшоў у прафесійны каледж. Настаўнікі ды суседзі характарызуюць юнака як вельмі добрага, выхаванага маладога чалавека. І толькі пра бацьку яго ў гарадку цяпер расказваюць, што часта піў і тэрарызаваў сям'ю. Яго і першая жонка праз гэта кінула. А цяперашняя свае праблемы старалася хаваць ад навакольных — баялася, што можа быць яшчэ горш. Бо яна грамадзянка Украіны, мае толькі пасведчанне на права жыхарства, сваякоў у Беларусі няма. Лічыла, што ісці і прасіць абароны бессэнсоўна, таму трэба цярпець. Дацярпелася: сын, які марыў атрымаць адукацыю і будаваць сваё шчаслівае жыццё, цяпер адправіцца на зону.

Кажуць, што ў крамах іх маленькага гарадка з'явіліся скарбонкі для ахвяраванняў на адваката для хлопца. Людзі ў гэтай сітуацыі спачуваюць не ахвяры злачынства, а таму, хто яго здзейсніў...

Шмат гадоў таму мне давялося быць у зале суда, дзе людзі плакалі, бо спачувалі таму, хто быў на лаве падсудных. Тады зусім малады хлопец у Ляхавіцкім раёне забіў нажом зводнага брата, які вярнуўся з турмы і здзекаваўся з маці. Тое хлапчанё, як высветлілася, цягнула на сабе няхітрую дамашнюю гаспадарку і малодшую сястру. Ходзячы ў тэхнікум, ён гатаваў ежу, мыў бялізну, адпраўляў сястру ў школу. Маці тым часам жыла ў вёсцы. Гора, а не маці — злоўжывала спіртным, дзяцей амаль не глядзела. Але тады былі 90-я гады. Міліцыя магла не прыехаць на выклік з прычыны «адсутнасці бензіну». Ды і жанчына-выпівоха наўрад ці ўсведамляла, што ў сямейнай трагедыі цалкам яе віна. Яна ж праз дзень тэлефанавала і скардзілася малодшаму, што старэйшы яе б'е... Адвакаты вучылі хлопца, як трэба гаварыць на судзе, але ён не паслухаў. Сказаў, што зрабіў усё правільна, бо брат усё роўна забіў бы маму, ды і яго ў прыдачу. Падлетку далі тады дзевяць гадоў.

### НЕ НАЗАПАШВАЦЬ ПАКУТЫ

У сённяшніх маіх гераінь іншая сітуацыя. Першая з іх мае вышэйшую адукацыю, добрую работу, павагу з боку навакольных. І калі пабывала на валасок ад смерці, мабыць, разумее, што не варта было цярпець столькі гадоў. Можна было на кожны скандал выклікаць міліцыю і дабівацца высялення дэбашыра. Варта было ісці на кансультацыі да юрыстаў і шукаць нейкага паратунку, а не назапашваць пакуты, «кожны дзень гледзячы на п'яную морду», як скажа пазней у судзе.

Ахвяры гвалту заўсёды знаходзяць апраўданні. Як і ў другой гісторыі. Не мела грамадзянства, баялася, што пры разводзе суд можа пакінуць сына з бацькам, які мае большую зарплату і на якога запісана кватэра. Але ці варта было трымацца за тую кватэру і за канечную работу ў краме? Даярчы на ферме, што знаходзіцца за нейкіх 8—10 кіламетраў ад іх горада, атрымліваюць да 1500 рублёў зарплаты. Магчыма, на той ферме ўсе вакансіі занятыя, але можна было пашукаць іншую, няхай сабе размешчаную далей і з меншай зарплатай, але там маглі б даць і дамок.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

І калі сын сядзеў з ёй у магазіне да канца рабочага дня, каб толькі не заставацца дома з бацькам, думаю, ахвотна паехаў бы ў вёску. А сёння, магчыма, была б ударніцай сельскагаспадарчай працы, паважанай маці-адзіночкай, а не замужняя маці сына, якога будуць судзіць за цяжкае злачынства і які, хутчэй за ўсё, адправіцца ў турму.

### ВЫДАТКІ ВЫХАВАННЯ

Добра разважаць, седзячы за камп'ютарам, калі табе нічога не пагражае — скажа нехта з тых, хто кожны дзень жыве ў страху. Не так даўно выпадкова сустрэлася з даўняй знаёмай Наталляй, якая пасля дваццаці гадоў шлюбу адважылася на развод. Калі гэтая прыгожая, з дзвюма адукацыямі, з інтэлігентнай сям'і жанчына расказала сваю гісторыю, я не стрымалася: «Ты што, вар'ятка, як магла такое цярпець?!» А яна нават трохі пакрыўдзілася, сказала, што яе выхоўвалі ва ўсведамленні, што сям'я — гэта святое, што рушыць яе нельга ні ў якім разе, што развядзёнка — гэта сорам, а дачцэ патрэбны бацька. І толькі калі дачка вырасла і паступіла ў ВНУ, яна адважылася. А пасля разводу перажыла дэпрэсію, не дапамагалі нават таблеткі, але паступова неяк акрыяла і цяпер выбудоўвае новае жыццё.

...Здаецца, у Каране напісана, што цярпенне прыгожае. Яно і можа быць прыгожым да пэўнай ступені ў асяродку нармальных людзей. Але цярпенне ў дачыненні да агрэсара надта часта прыводзіць да бяды. Ад агрэсара трэба шукаць паратунку, тут ужо не да сораму, не да боязі за тое, што людзі скажуць. Вось толькі адна лічба з міліцэйскай статыстыкі. За тры месяцы мінулага года ў органы ўнутраных спраў Брэстчыны паступіла больш за 2400 паведамленняў аб гвалце ў сям'і. Некаторыя з іх выпадковыя, «аднаразовыя», у некаторых, як той казаў, абое рабое, бо разам пілі, а потым высвятлялі адносіны, а назаўтра памірыліся. І ўсё ж гэта вельмі вялікая лічба. Так быць не павінна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Для душы

# ВЕЛІКОДНЫЯ ВЕРБЫ ДАМІНІКІ КАВАЛЁНАК

**Тэхналогію ўпрыгожвання вярбінак, якімі ў былыя часы славіўся заходні край, адрадзілі чатыры сястры-майстрыхі з Гродна. Яны робяць букеты, якія атрымалі назву «гродзенскіх вербаў». Нам удалося сустрэцца з адной з сёстраў — Дамінікай КАВАЛЁНАК, якая за сваю ўнікальную творчасць атрымала званне народнага майстра Беларусі.**

— Гродзенскую вярбу можна адразу пазнаць: яна яркая, як вясёлка, мае плоскую форму і ўпрыгожана толькі раслінамі — сухімі кветкамі, каласкамі. Але ў такім выглядзе велікодныя букеты пачалі з'яўляцца не так даўно. Сама майстрыха Дамініка Кавалёнак успамінае, што раней у храм насілі асвячаць немудрагелістыя «букеты» — галінкі вярбы з каляровымі ніткамі альбо папяровымі стужкамі. Але была на Гродзеншчыне і іншая традыцыя. Гадоў сто таму тут рабілі ўнікальныя «пальмы». Такая традыцыя захавалася і ў сям'і Дамінікі Кавалёнак. І ўжо ў сталым узросце яна з сёстрамі вырашыла распаўсюдзіць забытую тэхналогію. Яркія вербы сясцёр атрымалі шырокі попыт. А каб старажытная традыцыя не згасла, тэхналогію іх складвання ўнеслі ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Увогуле тэхналогія сама па сабе не такая і складаная. Бяруцца галінкі вярбы (3, 5, 7 ці больш) і паступова ўпрыгожваюцца выключна раслінамі, нарыхтоўка якіх вядзецца з вясны да восені. У галінкі вярбы, якія Дамініка Кавалёнак зрабіла сёлета, уплецены лясны катоўнік, кукуруза, мох, заечы хвост, цімафееўка і многае іншае. Некаторыя кветкі яна



вырошчвае на дачы, некаторыя збірае ў полі ці на лузе.

Адна з асаблівасцяў гродзенскай вярбы — гэта абавязковыя каласкі. Пшаніца, авёс, жыта, ячмень... Добра падыходзіць і лён. Некаторыя каласкі фарбуюцца. Расліннае напаўненне кладзецца ярусамі, і на кожным з іх — каласкі. Яны могуць быць і каляровыя, і звычайныя, без афарбоўкі.

— Я працую не для бізнесу, а для душы, у мяне няма канвеера, — кажа Дамініка Кавалёнак.

Яно і зразумела. З гэтымі вербамі вернікі ідуць у храмы ў Вербную нядзелю, за тыдзень да свята Пасхі. Тым самым людзі ўслаўляюць уваход Гасподні ў Іерусалім. Захоўвалі вярбу дома да наступнага года, а часам, і даўжэй — гэта ж своеасаблівы твор мастацтва!

Майстрыха расказала, што пачала рабіць вербы напачатку 80-х гадоў, «калі скончыўся атэізм». Шчыравала тады толькі для сябе і сваёй сям'і, але з цягам часу пашырыла межы, і цяпер у даволі сталым узросце не пакідае свайго занятку, шукае новыя формы, матэрыялы, колеры. Нядаўна прыдумала эксклюзіўную вербачку з новым філасофскім падтэкстам.

— Аснова букета — вярба — гэта шлях да Бога, — кажа жанчына. — Вось такія кветкі — кружочкі трох колераў — гэта наш жыццёвы святлафор. З ім мы ідзём па дарозе шукаць сэнс жыцця. А зверху — каласкі сямі колераў вясёлкі. Гэта тое, што ёсць у прыродзе. Але чалавеку важна знайсці і духоўны сэнс. А ён просты — трэба рабіць больш дабрыні, тады і на душы лягчэй стане, бо злосць наўрад ці прынясе задавальненне. А вось праз любоў мы можам знайсці гэты самы шлях.

У Дамінікі Кавалёнак няма задумак. Цяпер, напрыклад, жанчына занялася вырабам фларыстычных карцін з выявай усіх пораў года. Ужо зрабіла зіму і вясну, на чарзе — лета. За далейшы лёс гродзенскіх вербачак яна спакойная. Бо тое, што ўдалося адрадзіць, стала нацыянальнай спадчынай. Падобнай тэхнікай авалодваюць іншыя народныя майстры і нават самі праводзяць майстар-класы. Не застаецца ўбаку і сама Дамініка Дамінікаўна. Яна разам з сёстрамі па-ранейшаму «круціць» пасхальныя вербы, якія не толькі зачароўваюць сваімі колерамі, але і дыхаюць цеплынёй.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**




Жамчужына з 975-гадовай гісторыяй

# Багатая спадчына і ўстойлівая будучыня Навагрудчыны



Макеты славутасцяў Навагрудчыны можна адрозніць ад сапраўдных будынкаў толькі па памеры.

**Навагрудскі раён нейкім чарадзейным чынам спалучае ў сабе аграрна-прамысловыя дасягненні, багатую гісторыка-культурную спадчыну, якую цяжка знайсці ў іншых мясцінах краіны, і ўпэўнена трымае курс на ўстойлівае развіццё, займаючыся «зялёнай» эканомікай. Тут мірна суіснуюць прадстаўнікі розных канфесій. Царква і касцёл — на адной плошчы, непадалёк ад цэнтра — мусульманская мячэць. А манахі Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага манастыра, што каля вёскі Гнесічы, удзельнічаюць у святах, прапануючы гасцям уласнае печыва і зёлкі. Пра дасягненні і планы рэгіёна карэспандэнту «Звязды» распавёў старшыня Навагрудскага райвыканкама Сяргей ФЕДЧАНКА.**



## ПРАДУКТЫ І МЕТАЛАВЫРАБЫ НА ЭКСПАРТ

За мінулы год тут выканалі заданні па 17 з 20 ключавых паказчыкаў развіцця. База прамысловасці раёна — дзесяць прадпрыемстваў, якія больш за палову прадукцыі рэалізуюць за межы Беларусі ў 23 краіны свету. Гэта заводы газавай апаратуры, металавырабаў, хлебазавод, малочнае прадпрыемства «Навагрудскія Дары», вінзавод, дзве швейныя фабрыкі (на адной з іх вырабляюць спецадзенне, на другой — звычайнае). Прыватнае беларуска-ізраільскае прадпрыемства «Леор Пластык» гатуе салаты з гародніны і рыбныя прысмакі. «ПравітБел» — таксама прыватнае прадпрыемства, якое займаецца паўфабрыкатамі з гародніны і мяса. За мінулы год прамысловасць раёна павялічыла аб'ём вытворчасці амаль на 12 % і выpабіла прадукцыі на 360 мільёнаў рублёў.

— Індэкс фізічнага аб'ёму летась падрос на 4,7 %, гэта трэці вынік па ўсёй Гродзенскай вобласці, — расказаў пра поспехі раёна Сяргей Федчанка. — За гэты час мы экспартавалі лесаматэрыялы і швейную прадукцыю на новыя рынкі трох краін: Кіпра, Нідэрландаў, Чэхіі.

Амаль на 10 % падрасла вытворчасць сельскай гаспадаркі. У раёне восем арганізацый, на кожную з якіх у сярэднім прыходзіцца каля васьмі тысяч гектараў зямельных угоддзяў. Летась раён упершыню перайшоў мяжу ў пяць тысяч тон па надоях малака.

Раённае будаўніча-мантажнае ўпраўленне займаецца ўзвядзеннем жылля і вытворчых памяшканняў. Летась збудавалі тры шматкватэрныя дамы і ферму. Сёлета ў Навагрудку з'явяцца яшчэ два дамы.



Сонечныя панэлі «падаграюць» ваду для аддзяленняў раённай бальніцы.

## ГАРАЧАЯ ВАДА АД СОНЦА І ШТУЧНАЯ ЛЫЖНЯ

На Навагрудчыне функцыянуюць раённая бальніца, чатыры амбулаторыі ўрача агульнай практыкі, дзве бальніцы сястрынскага догляду і 22 фельчарска-акушэрскія пункты. Дарэчы, па выніках 2019 года Ацмінаўскі ФАП стаў найлепшым у краіне.

— Летась набылі чатыры машыны хуткай дапамогі, а сёлета ў раёне з'явіцца аўтамабіль хуткай дапамогі класа «В». Хоць бы адна такая машына павінна быць, — упэўнены старшыня. — Паставім у бальніцы тамограф. Спецыяльна пад яго рэканструюем адпаведныя памяшканні, на што пойдзе каля 420 тысяч рублёў. Гэтае абсталяванне будзе абслугоўваць Навагрудскі і Карэліцкі раёны.

Рэканструявалі сістэму гарачага водазабеспячэння для радзільнага аддзялення, рэанімацыі і аперацыйнага блока бальніцы — вада цяпер падаграецца з дапамогай цеплавых помпаў і сонечных панэляў. Сёлета тут усталююць яшчэ фотаэлектрычныя панэлі, каб павялічыць эканамічны і экалагічны эфект.

Спартыўнае жыццё на Навагрудчыне таксама насычанае: тры спартыўна-юнацкія школы, знакаміты на ўсю краіну біятлонны комплекс «Сялец» са штучнай сістэмай аснежвання.

— Ужо набылі лазню для спартсменаў, зрабілі праектна-каштарысную дакументацыю для падаўжэння трасы, каб можна было праводзіць міжнародныя спаборніцтвы, — падзяліўся Сяргей Федчанка.

А яшчэ сёлета пачне сваю работу новы фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Лідар» з басейнам і спартыўнымі пляцоўкамі для самых розных заняткаў.

## «ЗЯЛЁНАЯ» ЭНЕРГЕТЫКА І ВЫРАБЫ З АДХОДАЎ

Гарадскія ўлады актыўна супрацоўнічаюць з Еўрапейскім саюзам і ПРААН, рэалізоўваюць розныя праграмы, імкнучыся зрабіць Навагрудак «смарт-сіці». Летась у горадзе з'явілася 400 «разумных» святлодыёдных ліхтароў. Гэта не толькі зрабіла вуліцы больш светлымі, але і дазволіла сэканоміць мінімум 30 % электраэнергіі, якая спатрэбілася б для работы старым лямпачкам. Авалодалі на Навагрудчыне і энергіяй ветру. У мясцовым ветрапарку 20 установак агульнай магутнасцю звыш 32 МВт — гэта амаль трэць такіх крыніц энергіі ў краіне.

У аграрным каледжы Навагрудка стварылі вучэбна-кансультацыйны цэнтр па аднаўляльных крыніцах энергіі, ахове навакольнага асяроддзя, рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў і энергазберажэнні. А яшчэ з'явілася новая спецыяльнасць «Ахова навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў». Для каледжа набылі камплект ветраэнергетычнай установкі магутнасцю 2,8 кВт, камплект геліяводанагравальнай установкі на 200 літраў. У першым паўгоддзі 2020-га плануецца ўстаноўка фотаэлектрычных панэляў магутнасцю 1,2 кВт.

Сёлета ў горадзе пачнуць мадэрнізацыю двух дамоў, дзе створаць комплексную інтэлектуальную сістэму для падліку спажывання чатырох відаў рэсурсаў: цяпла, вады, газу, электрычнасці. Гэта будзе першая інтэграваная сістэма ў Беларусі.

Тры гады таму ў раёне была запушчана сарціровачная лінія камунальных адходаў. У Гродзенскай вобласці, дарэчы, штогод збіраецца каля 10 тысяч тон палімераў для перапрацоўкі. У мінулым годзе пачалася рэалізацыя сумеснага праекта Еўрапейскага саюза і Навагрудскага райвыканкама «Стварэнне патэнцыялу для поўнай утылізацыі цвёрдых камунальных адходаў для ўстойлівага развіцця чатырох раёнаў Гродзенскай вобласці з увядзеннем ініцыятывы дзяржаўна-прыватнага партнёрства і распрацоўкай адукацыйных праграм для ўстаноў адукацыі і насельніцтва». Мяркуецца, што тут збудуюць тэхналагічную лінію для рэцыклінгу палімераў з аб'ёмам гатовай прадукцыі каля тысячы тон. Яе плануюць увесці ў 2022 годзе. Шляхам перaапрацоўкі тут збіраюцца вырабляць пластмасавыя гранулы. У межах праекта плануецца пастаўка кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў і спецыяльных прэсаў у Дзятлаўскі, Іўеўскі і Карэліцкі раёны.



Галоўная плошча Навагрудка.

## БІЗНЕС — ПРЫВАТНІКАМ, ГІСТОРЫЯ — НАВАГРУДЧАНАМ І ТУРЫСТАМ

Гістарычныя помнікі Навагрудчыны прыцягваюць у раён турыстаў, аднак не ў такой меры, як хацелася б мясцовым жыхарам. Турызм тут, як правіла, аднадзённы, бо існуе праблема з пражываннем. У горадзе толькі адна прыватная гасцініца на пару дзясяткаў месцаў. Пераначаваць можна таксама пры касцёле, але гэты варыянт не для ўсіх. Камунальную ж гасцініцу выкупіла прыватнае прадпрыемства горада, мяркуючы мадэрнізаваць яе па апошнім слове, зрабіць сучасны ліфт. Зараз будаўнічыя работы працягваюцца. У хуткім часе павінны адчыніць дзверы дзве прыватныя гасцініцы і хостэл.

— Гасцінічны бізнес і павінен быць у прыватных руках, а пажадана, каб сюды прыйшоў інвестар з Расіі ці Польшчы, які следам за сабой прывёў бы і турыстаў. Мы гатовыя забяспечыць ім усе ўмовы для работы ў межах закона, — упэўнены старшыня райвыканкама. — У нас аказваюць турыстычныя паслугі, праўда, вывазныя. Мы ж зацікаўлены ў тым, каб прыязджалі да нас. Аграсядзіб у нас таксама шмат, і на іх робім стаўку. У асноўным яны прапануюць паслугі па індывідуальным і калектыўным размяшчэнні. Некаторыя з іх забяспечваюць гасцей харчаваннем, экскурсійнымі паслугамі, прапануюць пракат лодак, веласіпедаў, спартыўнага інвентару. Тое ж самае датычыцца і прыватнікаў, якія прыйдуць да нас з вытворчасцю, — зробім усё, каб яны тут засталіся і маглі зарабляць.

Малы бізнес у раёне ёсць прынамсі і цяпер. Ён досыць малады, але ўжо даказаў сваю значнасць і ўдзельнічае ў фарміраванні даходаў бюджэту. На Навагрудчыне працуе каля 300 малых і сярэдніх прадпрыемстваў і больш за 1150 прадпрымальнікаў.

Горад развіваецца і ўпрыгожваецца. Летась да 975-годдзя ў Навагрудку на перасячэнні вуліц Валчэцкага і Чапаева заклалі дубова-ліпавую алею, усталявалі памятны знак. З удзелам моладзі пасадзілі парк маладых сем'яў. Стварылі ўязную браму, зарыбілі возера Маладзёжнае.

А алея ліхтароў, створаная яшчэ раней, даўно стала адным з улюбёных месцаў прагулак месцічаў. Кожны ліхтар тут асаблівы і сімвалізуе напрамак дзейнасці прадпрыемства ці ўстановы, якое яго стварыла. Тут ёсць ліхтар у выглядзе горна і барабана, якія сімвалізуюць піянерыю. Ліхтар, слуп якога абвівае змяя, — сімвал сістэмы аховы здароўя. Элегантны джэнтльмен у смокінгу і капелюшы прадстаўляе швейную фабрыку... Адным словам, цікава і індывідуальна.

Не забываюцца на Навагрудчыне і пра гістарычныя, прыцягальныя для турыстаў месцы раёна. Каля возера Свіцязь зрабілі экалагічную сцежку. Аднавілі капліцу былога маёнтка Чамброў, што непадалёк ад аграгарадка Валеўка. Яе ўжо ўключылі ў турыстычны маршрут «Шляхам Адама Міцкевіча». У вёсцы Мотча каля крыніцы, што асвечана ў гонар Мікалая Цудатворцы, устанавілі скульптуру святога Матфея.

У марах Навагрудчыны яшчэ шмат цікавага, чым першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага будзе здзіўляць і ўражваць беларусаў і гасцей. Нездарма ж Навагрудак лічыцца жамчужынай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**



Алея ліхтароў арганізацый і ўстаноў Навагрудскага раёна — адно з любімых месцаў для прагулак тутэйшых.

# Экатурызм і паляванне з Навагрудскім лясгасам

**«Які лес без цудаў!», сцвярджае народная прымаўка і не памыляецца. У любым лесе мноства цікавага. А калі яго яшчэ рупліва даглядаюць, то прырода праяўляе свае дзівосы напоўніцу. У паляўнічай гаспадарцы Навагрудскага лясгаса проста на волі прыжыўся статак зуброў і мядзведзь, якія перасяліліся сюды з Налібоцкай пушчы. А ў лясным пітомніку гадуюць расліны, якія для беларускіх краявідаў пакуль госці, але ўжо адчуваюць сябе тут як дома.**


Міхаіл ІГНАЦІК, дырэктар Навагрудскага лясгаса.

### Любчанскія трафеі, здымкі і драпежнікі

Тэрыторыя Навагрудскага лясгаса, у складзе якога 12 лясніцтваў, ахоплівае землі трох раёнаў: Навагрудскага, Карэліцкага і часткова Лідскага. Сюды ж уваходзіць частка Налібоцкай пушчы. Мясцовыя пасяляюць і лес ахоўваць ды аднаўляць, і здаровы лад жыцця прапагандаваць. Менавіта такім, на думку тутэйшых, павінен быць адпачынак на прыродзе. Для гэтага ствараюць усе ўмовы, не забываюцца пра гістарычную спадчыну краю.

— Напрыклад, у паляўнічым комплексе ў Любчы адпачынак цудоўна ўпісваецца ў пейзаж замка Яна Кішкі, які стаіць на беразе Нёмана. Тут можна шыкоўна адпачыць на рацэ як паляўнічым, так і сем'ям з дзецьмі, а таксама зладзіць карпаратывы, вяселлі, юбілеі, хрэсьбіны. І спалучаць гэта з прагулкамі па гістарычных мясцінах, — гаворыць **Міхаіл ІГНАЦІК, дырэктар Навагрудскага лясгаса.**

Паляўнічы домік стаіць амаль на беразе Нёмана: рака цячэ літаральна за плотам. Вялізная тэраса на другім паверсе, тры пакоі і агромністая гасцёўня могуць змясціць больш за 20 чалавек. У двары — лазня, маразільная скрыня для здабычы паляўнічых, вальеры для сабак.

Комплекс быў першай у краіне падобнай установай. Стварылі яго ў 2007 годзе намаганнямі былога (на працягу 14 гадоў) кіраўніка лясгаса, цяперашняга намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце Аляксандра ДАСЬКО:

— Мы былі тады піянерамі ў прыцягненні ў краіну замежных паляўнічых. І цяпер яны таксама з радасцю едуць. У сакавіку на пералётнага гуся завіталі расіяне. Увосень чэхі збіраюцца паляваць на аленя, а немцы — на лася. Для аматараў фота ўсталяваны спецыяльныя вышкі, на якіх, запэўніваюць, заўжды дачакаешся свайго звера для кадра.

### Экскурсіі каля Свіцязі

Адна з вядомых на ўсю краіну разынак Навагрудскага лясгаса — возера Свіцязь, якое знаходзіцца на тэрыторыі Свіцязянскага заказніка. Возера з чысцюткай вадой, дзе летам адпачывае да 10 тысяч чалавек, вабіць турыстаў з усёй Беларусі.

Амаль на самым беразе гаспадарка стварыла гасцявы комплекс — дом для сямейнага адпачынку. На ўваходзе гасцей сустракае драўляны мядзведзь са шчупаком у руках, а на падворку зроблена ўсё для адпачынку: альтанкі, мангал, месца для гульняў на свежым паветры і вялізнае памяшканне для банкетаў. Праўда, мясцовыя ўжо плануюць пашыраца і збудаваць яшчэ некалькі асобных дамкоў, лазню, арганізаваць пляцоўку для спартыўных гульняў.

Непадалёк ад тэрыторыі пачынаецца экалагічная сцежка, якая, пятляючы праз лес, вядзе да возера. Уздоўж яе — шыльдачкі з легендамі пра возера Свіцязь і апісаннем таго, што тут расце.

— Мы хочам, каб турысты не проста прыязджалі паплаваць ды пазагараць, а адукоўваліся, даведваліся пра месца, дзе знаходзяцца, — кажа Аляксандр Дасько. — Па экасцежцы і дзетак водзім, расказваем-паказваем, што ў лесе расце, хто жыве.

### Для тапіярыя, клумбы, агароджы і ежы

Пітомнік Навагрудскага лясніцтва гадуе расліны як для аднаўлення і павелічэння лесу, так і для азелянення горада і прыватных сядзіб. Дэндрапарк, які раскінуўся перад адміністрацыйным будынкам лясніцтва, нагадвае старадаўні сялянскі падворак, упрыгожаны сучасным ландшафтным дызайнам.


Лесавод Вераніка РАБАЯ — гаспадыня казачнага дэндрапарку.

Сапраўдныя воз і сані, дэкаратыўныя калодзеж і казачная хатка прывабліваюць школьныя экскурсіі, для якіх гэта своеасаблівы ўрок, які ад падворка працягваецца ў цяпліцах, дзе малыя нават дапамагаюць.

А яшчэ дэндрарыум — гэта выставачная зала.

— Многія нашы пакупнікі не ўяўляюць, як будзе выглядаць пэўная расліна ў вялікім стане, таму наведванне гэтага падворка — шанс на ўласныя вочы ўбачыць, што яны набываюць. Адсюль я і чаранкі для пасадкі бяру, — дзеліцца **лесавод Вераніка РАБАЯ.** — Найбольшым попытам карыстаюцца туі для жывой агароджы. Вечназялёны самшыт часта бяруць саджаць уздоўж сцяжынак або для невысокіх бардзюраў, а многія — для выстрыгання фігурак для тапіярыя.

### 100 гадоў, каб лес вырас

У Навагрудскім лясгасе ёсць свой дрэваапрацоўчы цэх, будуецца завод для вытворчасці пелетаў, які павінен запрацаваць летам.

— Пасля запуску спадзяёмся атрымліваць прадукцыю з высокім дадатным коштам, які пакрые расходы на будаўніцтва і дазволіць пашырыць вырошчванне раслін для азелянення. Пры гэтым мы паменшым свае астаткі, перапрацоўваючы драўніну, якая не запатрабавана на рынку, — дзеліцца Міхаіл Ігнацік планамі лясгаса.

На тэрыторыі лясгаса функцыянуе восем школьных лясніцтваў, дзе малых заахвочваюць працай у лесе.

— Тут праходзяць факультатывы па батаніцы. Прыцягваем школьнікаў і да пасадак, — гаворыць Аляксандр Дасько. — Тры выпускнікі школьных лясніцтваў цяпер вучацца ва ўніверсітэце і вернуцца да нас працаваць. Гэта ў полі вынік бачны па ўраджаі ў той жа год, а каб нармальны лес вырас, трэба 100 гадоў.

У пітомніку на 11,5 гектара летась вырасцілі 3 млн 824 тысячы саджанцаў для лесу: сосны, елкі, лістоўніцы, дубы, бярозы, ясені, клёны, чорныя алешыны. Аднак са змяненнем клімату пакрысе мяняецца і відавы склад дрэў. Елка з паўднёвых межаў на поўнач рухаецца. Прыжываецца ў лесе і еўрапейская лістоўніца, якая расце настолькі хутка, што абганяе сасну і елку.

— Ствараючы лес, трэба глядзець на зямлю, што там лепш будзе расці. Сасна і на пяску прымецца, а елка ў такіх умовах вырасце непрыгожая. Ад якасці глебы залежыць і гушчыня пасадкі. Тую ж елку можна ў адным месцы праз 70 сантыметраў саджаць, а дзесьці — праз метр, — удакладняе **Святлана КАРАНЮК, начальнік пітомніка.**

Нездарма ж пісаў Гіпакрат, што «лечыць хваробы ўрач, але вылечвае прырода». Мясцовыя гэта разумеюць і заўжды рады гасцям: сваім, замежным, маленькім і дарослым.

УНП 500052800

# ДОБРА РОДЗІЦЬ У ПОЛІ — ХУТКА ГАДУЕЦЦА Ў ХЛЯВЕ

**Паміж самымі крайнімі пунктамі ААТ «Прынеманскі» — 50 кіламетраў. Гаспадарка — адзін з лідараў леташняга жніва, а малака здае столькі, колькі некаторыя ўсім раёнам не назбіраюць. За два месяцы 2020-га тут атрымалі ўжо 900 тысяч рублёў, а да канца года мяркуюць зарабіць 30 мільёнаў, якія пойдуць на далейшую мадэрнізацыю гаспадаркі, — адной з самых моцных у Навагрудскім раёне.**


Галоўны інжынер ААТ "Прынеманскі" Сяргей КАВЕЦКІ расказвае пра тэхніку гаспадаркі.

## Мацыён для карміліц

У гаспадарцы 500 работнікаў, 90 з якіх пенсіянеры. 2400 гектараў збожжавых даюць добры ўраджай. А яшчэ тут штодня атрымліваюць 50 тон малака. Каровы — сапраўдныя карміліцы гаспадаркі, якія прыносяць 56 % выручкі. Зробленыя грошы ўкладваюць у мадэрнізацыю. Сёлета хочуць збудаваць навес для больш якаснага захоўвання тэхнікі і рэканструяваць малочнатаварную ферму «Вераскава».

Больш тэхналагічнае стойлавае ўтрыманне кароў, аднак нельга выключаць элементы аздараўлення на пашы, калі жывёл літаральна на гадзіну ў дзень выганяюць на выпас, каб малако набыло большую экалагічнасць. Толькі здаровая карова можа даць паўнавартаснае малако ў вялікіх аб'ёмах. Для жывёл гэта карысны для здароўя мацыён, лічыць **Андрэй САДОЎСКІ,** дырэктар ААТ «Прынеманскі» на працягу пяці гадоў, які нядаўна ўзначаліў Дзятлаўскі райвыканкам:

— МТФ «Вераскава» прывязная, і мы сваімі сіламі і за свае грошы рэканструюем яе пад ферму на 700 галоў з даеннем у даільнай зале. Плануецца павялічыць дойны статак яшчэ хоць бы на 300 галоў.

## «Ягуары» і «Кіраўцы»

Механізаваны двор — сэрца «Прынеманскага» памерам больш за пяць гектараў — умяшчае каля 60 трактароў і 50 грузавікоў.

У асноўным усе машыны айчыннай зборкі. Праўда, летась купілі новы кормаўборачны камбайн «Ягуар», бо адзін ужо ў гаспадарцы сваё адпрацаваў. Два вялізныя чорна-жоўтыя трактары «Кіраўцы» ў «Прынеманскім» яшчэ з савецкіх часоў, і яны на вагу золата. Энерганасычаныя машыны працуюць у полі для дыскавання ці культывацыі, а падчас нарыхтоўкі кармоў для трамбоўкі альтэрнатывы ім проста няма.

— За кошт сваёй вагі, устойлівасці і эксплуатацыйных характарыстык яны ідэальныя дапаможнікі для такой работы, калі трэба туды-сюды круціцца, каб ушчыльніць кармы. Нават сучасны «Амкадор» гэтую задачу так не выканае, — кажа **Павел ШЫБУТ, намеснік дырэктара,** — тым больш што нарыхтоўваем мы шмат — 50 тысяч тон травяністых кармоў: сенажу і сіласу.

## Гаспадарчы падыход

Да пасяўной рыхтуюцца загадзя. Усе плугі даводзяць да ладу яшчэ да Новага года, перш чым паставіць іх на захоўванне. А вось іншае абсталяванне рамантуюць зімою, да 1 сакавіка заўжды ўсё гатова. Пасля — чарга машын для нарыхтоўкі кармоў.

— Рамонт тэхнікі пастаянны. Заканчваем работу з машынамі па корманарыхтоўцы — адразу бяромся за тэхніку, якая ідзе на ўборку. Пасля — за тыя, што працуюць на асенняй пасяўной, — дзеліцца **галоўны інжынер Сяргей КАВЕЦКІ.** — Прычым імкнёмся ўсё рабіць уласнымі сіламі, за выключэннем дэталяў, якія ўжо самі вытачыць не можам.

Падчас майго прыезду ў гаспадарцы напоўніцу ўносілі падкормку на палі з азімымі. Цяпер тут ужо сеюць яравыя.

— Пасля кожнага выезду ў поле тэхніку абавязкова мыюць, бо ўгнаенні і метал — рэчы несумяшчальныя. Калі адзін сезон адпрацаваць без догляду, машыну выкінеш, — кажа Павел Шыбут, паказваючы, як мыюць машыну для ўнясення мінеральных угнаенняў «Раса-05».


Ірына АРЦЮХ, галоўны заатэхнік малочнатаварнай фермы "Галынь" са сваімі гадаванцамі.

## Бульба, буракі, кукуруза

Раслінаводства ў гаспадарцы дасягнула свайго піку, лічыць дырэктар. Ураджайнасць цукровых буракоў — 923 цэнтнеры з гектара, а гэта еўрапейскі ўзровень. Бульбы — 521 цэнтнер, рапсу — 40,5 цэнтнера, збожжа — 58, кукурузы на зерне — 184 цэнтнеры, а на сілас — 560.

— Сёлета пачалі ўносіць угнаенні на палеткі на два тыдні раней, чым звычайна. Увесь комплекс веснавых работ робім. Падкормліваем і шматгадовыя травы, уносім мінеральныя ўгнаенні ў асноўную запраўку, робім заворванне і вываз арганікі, — паказвае на трактар, які раскідвае па полі гной, **галоўны аграном Андрэй ДАМУЦЬ.** — Звычайна ўсе пасяўныя работы да 9 мая завяршалі, цяпер будзе значна раней. 730 гектараў сёлета зоймем кукурузай, 400 гектараў аддадзім пад цукровыя буракі, 70 — пад бульбу.

## Залатая жыла

У гаспадарцы летась нарыхтавалі амаль па 40 цэнтнераў корму на ўмоўную галаву, таму не дзіва, што надаілі амаль 16,5 тысячы тон малака.

— Мы ўжо перажылі этап, калі малако падзялялася на «экстра», вышэйшы і першы гатункі, і выйшлі на самы высокі ўзровень. Малако — «залатая жыла», якая робіць усю эканоміку гаспадаркі, бо гэта штодзённы прыбытак, — сцвярджае дырэктар. — За амаль 50 тон атрымліваем 1,1 мільёна рублёў пры агульнай выручцы гаспадаркі 1,8 мільёна.

Уклад фермы «Галынь», дзе жывуць 2280 жывёлін, з якіх 725 — дойныя каровы і каля 60 цялятак, — 15 «малочных» тон у дзень, а летам даходзіць да 19 тон гатунку «экстра». Сёлета на ферме мяркуюць надаіць па восем тон з каровы.

У вялікім памяшканні, якое разлічана на 98 цялят і было збудавана ўвосень, цяпер каля 60 малышоў. У месячным узросце іх пераводзяць сюды з радзільнага аддзялення. У кожнага свой загончык, дзе яны гадуюцца да трох месяцаў.

— Тут іх і больш зручна абслугоўваць цялятніцам, і мікраклімат лепшы і стабільны ў параўнанні з тым, калі цяляты ўтрымліваюцца ў дамках, — паказвае сваю гаспадарку **Ірына АРЦЮХ, галоўны заатэхнік малочнатаварнай фермы «Галынь».** — За суткі цяляты прыбаўляюць 856 грамаў.

УНП 500001157

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# «НАВАГРУДСКІЯ ДАРЫ» — МАЛОЧНА-СЫРНЫ БРЭНД З ЭКСКЛЮЗІЎНАЙ СМАКАТОЙ




**Ці ведалі вы, што ў навальніцу малако кісне хутчэй? А, можа, чулі, што «птушынае малако» насамрэч існуе? Бо гэта праўда, ім у Антарктыдзе кормяць птушанят таты — імператарскія пінгвіны, і нават звычайныя галубы. Карыснае рэчыва ствараецца ў страўніку дарослых птушак. Пра дзівосы і карысць малака добра ведаюць на прадпрыемстве «Навагрудскія Дары» і гатуюць з яго каля 60 найменняў разнастайнай прадукцыі. Некаторыя прысмакі вырабляюцца толькі на экспарт.**

## МАЛАКО З МАЛАКА

«Навагрудскія Дары» — найбуйнейшае малочнае прадпрыемства Гродзеншчыны. Штодня тут перапрацоўваюць 440 тон малака, 100 тон з якіх ідзе на выраб сыроў: паўцвёрдых, мяккіх, расольных. З астатняга гатуюць абястлушчанае малако і вяршкі. З апошняга робяць масла.

— У нашым цэху вырабляюцца сухія малочныя прадукты: малако сухое абястлушчанае, малако сухое цэльнае і сыроватка падсырная сухая. Яны запатрабаваны такімі сусветна вядомымі брэндамі, як «Нэстле», «Мон'дэліс», «Вім-Біль-Дан» і іншыя, — расказала Святлана АШМАНКЕВІЧ, начальнік цэха сухіх малочных прадуктаў. — Нашы сухія вырабы выкарыстоўваюць у розных галінах харчовай прамысловасці. Яны — неабходныя інградыенты мноства прадуктаў: ад хлеба да шакаладных батончыкаў. Сёння абсталяванне нашага цэха дазваляе вырабляць прадукцыю ў адпаведнасці з сусветнымі стандартамі і, адпаведна, павышаць яе экспарт.

## ГЛАЗУРАВАНАЯ І ПЛАЎЛЕНАЯ САЛОДКАСЦЬ

Вядомыя прысмакі навагрудскага завода — глазураваныя сыркі «Капітошка» з водарам ванілі, какавы і з дабаўленнем пячэння.

— Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца сыркі з ванілінам, — заўважыла **Зінаіда КУР'ЯН, начальнік цэха цэльнамалочнай прадукцыі.** — Разыходзяцца яны не толькі па раёне, а і па ўсёй краіне.

Кожны месяц на прадпрыемстве гатуюць яшчэ каля тоны плаўленых сыроў у стаграмовых пластыкавых стаканчыках. Звычайны «Навагрудскі», сыр са смакам грыбоў і салодкі плаўлены з какавай...

Беларусам настолькі палюбіўся звычайны тварог з масавай доляй тлустасці 5 %, што яго вытворчасць літаральна за пару гадоў павялічылася з дзвюх тон у месяц да 25 тон.


Дырэктар прадпрыемства «Навагрудскія Дары» Дзмітрый АНТАНОВІЧ.

— Ён у нас атрымліваецца рассыпісты, як вясковы, вельмі карысны для людзей усіх узростаў, — дадала Зінаіда Кур'ян. — Акрамя таго, тварог дапамагае нармалізаваць абменныя працэсы ўнутры тканак і органаў, насычае кроў карыснымі рэчывамі, паляпшае страваванне.

Такі тваражны прыклад — сведчанне прадуманай палітыкі прадпрыемства, скіраванай на павелічэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі за кошт пашырэння асартыменту і павелічэння тэрмінаў захоўвання, а таксама фінансаванне інвестыцыйных праграм па тэхнічным пераўзбраенні.

— Мы арыентуемся на нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі. Сёлета запланавалі шэраг праектаў па мадэрнізацыі тэхналагічнага абсталявання, — адзначыў **дырэктар прадпрыемства «Навагрудскія Дары» Дзмітрый АНТАНОВІЧ.** — Удасканалім існуючыя сушыльныя комплексы, укараніўшы ў іх абсталяванне, якое дазволіць вырабляць сухое цэльнае малако і сухое абястлушчанае малако не толькі існуючага зараз гатунку «Стандарт», але сухога абястлушчанага малака гатунку «Экстра». Гэта дазволіць пашырыць рынкі збыту. А мадэрнізацыя цэху па вытворчасці сыроў з павелічэннем сутачнай вытворчасці з 10 да 15 тон дазволіць павялічыць штодзённы выраб сыроў у 1,5 раза і пашырыць лінейку прадукцыі.




## ЗВЫШЦВЁРДЫ «РЭДЖАНІТА» І ВАЛЮТНЫ «MAASDAM PREMIER»

Чырвоны, зялёны, з «вачыма», са смакам грэцкага арэха, таплёнага малака, з часнаком, вэнджаны... На навагрудскім прадпрыемстве кожны знойдзе сыр па гусце.



Сырная вытворчасць на прадпрыемстве зараз арыентавана на выраб паўцвёрдых сыроў з масавай доляй тлушчу ў сухім рэчыве 45 %, якія ў асноўным экспартуюцца. Гэта найбольш рэнтабельны прадукт, каля 220 тон якога штомесяц гатуюць на заводзе.

— Два асноўныя віды сыроў — галандскай групы і сыры з прапіёнава-кіслым браджэннем — з так званымі вачыма ў разрэзе ці папросту вялікімі дзіркамі, — расказаў **Дзмітрый ЕРАМЕЙЧЫК, начальнік сырцэха.**

Сёлета ў вытворчасці прыярытэтным з'яўляецца выраб эксклюзіўных экспартных сыроў «Мара Прэзідэнта» і «Галандскі беларускі». У 2020-м сырная лінейка папоўніцца яшчэ двума новымі прадуктамі: «Maasdam Premier» і «Галандскі Premier». Пробныя партыі ўжо зрабілі і адправілі на выпрабаванні, а з красавіка пачнуць пастаянны іх выраб. Усе чатыры віды знайсці на айчынных паліцах немагчыма — яны толькі для экспарту.

— У нас ёсць вельмі цікавыя і даволі незвычайныя прадукты. Цвёрды сыр Пармезан выспявае тры-чатыры месяцы, а звышцвёрды Рэджаніта — самадастатковая навінка прадпрыемства — цэлы год, — адзначыў ён. — Апошні прадукт вельмі вядомы, займае мноства прызавых месцаў і мае досыць паклоннікаў у вузкіх колах. Аднак вырабіць яго шмат немагчыма, бо сыр даволі далікатны і капрызны, а яшчэ трэба займаць плошчы цэлы год. Да таго ж яго нельга адрэзаць — неабходна адкалоць кавалкі спецыяльным нажом.

На прадпрыемстве ўпэўнены, што рэджаніта — удалы адказ беларускіх сыраробаў такім прызнаным еўрапейскім прадуктам, як пармезан і джугас.

Яшчэ адзін цікавы і сталы брэнд — сыры з напаўняльнікамі галандскай групы «Каралеўскія» з водарам таплёнага малака і грэцкага арэха. Яны і экспартуюцца, і прадаюцца ў краіне. Эксперты сырнай справы супакойваюць аматараў сыру: большасць вырабаў лінейкі «Навагрудскіх Дароў» застаецца ў Беларусі і па смаку ды якасці нічым не саступаюць валютным».

УНП 591607615.

# NOVOGAS ДЛЯ ВАС

## Экспартныя балоны і робаты-зваршчыкі Навагрудскага завода газавай апаратуры

**Прадпрыемства з 60-гадовай гісторыяй — адно з топ-30 найлепшых айчынных заводаў, якія штогод развіваюцца і з'яўляюцца прыкладам укаранення навацый, тэхналогій і пашырэння рынкаў збыту. Некаторыя працэсы вытворчасці рабатызаваны больш як на 90 %, а ўсю зварку ў асноўным робяць робаты. Новыя тэхналогіі прадпрыемства ў 2018 і 2019 гадах сталі лаўрэатамі конкурсу «Лідар энергаэфектыўнасці Рэспублікі Беларусь» у намінацыі «Энергаэфектыўная тэхналогія года». Летась завод стаў лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Зубры эканомікі». Якасць прадукцыі робіць яе запатрабаванай за мяжой, куды адпраўляецца амаль 80 % тавараў, а мадэрнізацыя вытворчасці ніколі не спыняецца.**


Дырэктар ААТ «Навагрудскі завод газавай апаратуры» Віктар ТУРЛЮК.

### Новыя тэхналогіі — канкурэнтная перавага

Некаторыя тэхналогіі завода — на ўзроўні сусветных стандартаў. Завод пастаўляе прадукцыю ў 13 краін свету: СНД, Лацінскую Амерыку, Італію, Польшчу, Балгарыю, дамаўляецца са Славакіяй, адправілі партыю балонаў у Мексіку. Больш за 40 прадпрыемстваў дылераў прадстаўляюць інтарэсы завода за мяжой. Пры гэтым патрэбы айчыннага рынку прадпрыемства закрывае на 100 %.

— Стаяць на месцы нельга, інакш там і застанешся, — упэўнены **дырэктар ААТ «Навагрудскі завод газавай апаратуры» (НЗГА) Віктар ТУРЛЮК.** — Таму наступным этапам разглядаем аўтаматызацыю зборак, каб у цэху засталося чатыры-пяць чалавек на ўпакоўцы прадукцыі. У старым балонным цэху будзе ўсталявана аўтаматызаваная лінія штампоўкі днішчаў. Гэта таксама сур'ёзны этап укаранення сучасных тэхналогій.

Тым не менш за 12 гадоў, якія Віктар Іосіфавіч узначальвае завод, і за 40 гадоў яго працы тут увогуле ніводнага чалавека на прадпрыемстве не скарацілі.

ААТ «НЗГА» мае развітую інфраструктуру: медыцынскі пункт са стаматалагічным кабінетам, сталовую, два інтэрнаты, спартыўную і трэнажорную залы, басейн, саўну. У кожнага работніка — медыцынская страхоўка, па якой ён можа атрымаць паслугі на 5000 рублёў. Маладыя і найбольш каштоўныя спецыялісты атрымліваюць цалкам абсталяваныя для жыцця кватэры ў новым інтэрнаце завода.


Зваркай на прадпрыемстве займаюцца робаты.

### Гонар прадпрыемства — рабатызаваныя лініі

У адным з чатырох модульных хардаў устанавілі дзве рабатызаваныя лініі. Іх абслугоўваюць літаральна чатыры чалавекі. Летась тут выпусцілі 750 тысяч вырабаў.

Вытворчасць у цэху газавых балонаў аўтаматызавана амаль на 90 %: плазменная рэзка выдае круглыя загатоўкі на балоны. На аўтаматычным штампоўачным комплексе з рулоннай сталі ствараюцца іншыя камплектуючыя для балонаў, прэс глыбокай выцяжкі робіць паўсферы. Пасля неабходнай тэхналагічнай дапрацоўкі загатоўкі адпраўляюцца на рабатызаваныя лініі зборкі-зваркі бытавых і аўтамабільных газавых балонаў, затым настае чарга тэхналагічнага адпалу карпусоў балонаў. Наступны крок — рэнтген-кантроль зварнога шва. Палімерная пафарбоўка і нанясенне надпісу таксама аўтаматызаваны.

Апошні этап — пнеўма- і гідравыпрабаванні на герметычнасць і адгрузка прадукцыі на склад, які адразу за дзвярыма цэха. Такая лагістыка дазваляе эканоміць час. На экспарт вязуць прадукцыю ў тым ліку і на заводскіх фурах. Гэта і дадатковы заробак, і назад можна прывезці сыравіну для завода, і мінімізаваць выдаткі на транспарціроўку. З Расіі завод атрымлівае сыравіну з латуні і алюмінію, пракат стальны, камплектуючыя.

### Бяспечны вентыль

За апошнія пяць гадоў на заводзе памянялі шмат абсталявання. Літаральна некалькі тыдняў таму атрымалі шматфункцыянальную трансферную ўстаноўку па апрацоўцы карпусоў запорнай арматуры.

На абсталяванні Neotecman, якое цяпер працуе на заводзе ў цэху газавых прыбораў, штампуюцца самі карпусы вентыля. Тэхналогія вытворчасці карпусоў запорнай арматуры метадам гарачай безаблойнай штампоўкі ўнікальная для Беларусі. Усе прэс-формы, дарэчы, распрацаваны спецыялістамі завода і адобраны вытворцамі абсталявання.


Выпускаюць на заводзе і прадукцыю для камплектоўкі брэсцкіх пліт Гефест — тэрмарэгулятар з прыладай засцерагальнай (ТПЗ). Паверхня і разьба ТПЗ павінна быць ідэальнай. Дзеля гэтага на заводзе ўкаранілі 13 апрацоўчых цэнтраў, якія працуюць цалкам аўтаматычна, чалавек тут непатрэбны.

— А вось апрацоўваць загатоўкі будуць ужо на трансфернай устаноўцы з рабатызаванай загрузкай-выгрузкай дэталяў, — расказвае **Марыя ДЗЕДАВЕЦ, начальнік бюро маркетынгу.** — Гэтае абсталяванне заменіць 13 станкоў, магчымасці якіх ужо не спраўляюцца з патрэбамі прадпрыемства, што павялічыліся. Заяўкі на вентыль балонны з засцерагальным клапанам паступаюць з Літвы, газавыя балоны з такой запорнай прыладай адпраўляем і ў Расію. Наяўнасць засцерагальнага клапана на запорнай прыладзе бытавых газавых балонаў з'яўляецца патрабаваннем да прадукцыі, каб пастаўляць яе на рынак Еўрапейскага саюза.

Пакупка штамповачнага комплексу дазволіла пашырыць асартымент шаравых кранаў, цяпер тут вырабляюць шаравыя краны для вады і газа з рознымі тыпамі далучэнняў і рознымі ручкамі.

Яшчэ адно ўдасканаленне для працы знаходзіцца на тэрыторыі завода — устаноўка для змешвання газаў: аргону і вуглякіслага газу для зваркі.

— Раней іх прывозілі ў балонах і расстаўлялі на пасты зваркі. Трэба было штодня мяняць балоны і адпраўляць у Мінск на наступную партыю, што было затратна па часе і фінансава. Цяпер тэхнічныя газы прывозяць у цыстэрнах і перапампоўваюць у ёмістасці, дзе адбываецца аўтаматычнае змешванне, і сумесь адразу падаецца па трубаправодзе на пасты зваркі, — звяртае ўвагу прадстаўніца завода.

### Кантроль якасці брэнда

Рэнтген-кантроль на заводзе праходзіць амаль 100 % вырабаў, хоць нормы такой колькасці і не патрабуюць. Аднак таварны знак Novogas стаў пазнавальным брэндам са станоўчымі характарыстыкамі. Праз гэта работнікі не расслабіліся, а, наадварот, яшчэ больш пільна пачалі ставіцца да якасці.

— Актыўна сертыфікуем прадукцыю на адпаведнасць еўрапейскім стандартам і патрабаванням тэхрэгламентаў Мытнага саюза. Асвойваем новыя мадэлі і тыпапамеры, пашыраем рынкі збыту. Трымаем курс на Заходнюю Еўропу і Паўднёвую Амерыку, — дзеліцца **Ігар КАПЦІЛОВІЧ, намеснік дырэктара па камерцыі.** — Прымяняем новыя тыпы запорных прылад, і фарбуем балоны ў тыя колеры, якія неабходны ў краінах для пастаўкі. Асвойваем і новыя спосабы ўпакоўкі. Робім усё, каб быць бліжэй да кліента і задавальняць яго патрэбы.

Асартымент тыпапамераў балонаў на прадпрыемстве пастаянна пашыраецца, што патрабуе вялікай колькасці аснасткі, а значыць, усе спецыялісты пры рабоце. Хоць і кажуць пра век электрамабіляў, аднак машыны з рухавікамі ўнутранага згарання будуць існаваць яшчэ дзесяцігоддзі, так што без працы прадпрыемства не застанецца, упэўнены тут.

УНП 500235715.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара і з архіва прадпрыемстваў.**

Организация

# Общество с ограниченной ответственностью «Датч Стар»

Учетный номер плательщика: **191061436.**
Вид экономической деятельности: **68320.**
Организационно-правовая форма: **хозяйственное общество.**

Орган управления: **общее собрание участников.**
Единица измерения: **тыс. руб.**
Адрес: **220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, оф. 860.**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2019 г.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2019 г. | На 31 декабря 2018 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 1 466 | 798 |
| амортизация | 102 | (407) | (28) |
| остаточная стоимость | 110 | 1 059 | 770 |
| из нее остаточная стоимость ОС, переданных ОАО по договору безвозмездного пользования | 110a | - | - |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 14 | 9 |
| амортизация | 112 | (10) | (7) |
| остаточная стоимость | 120 | 4 | 2 |
| Доходные вложения в материальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | 583 | 656 |
| амортизация | 122 | (88) | (264) |
| остаточная стоимость | 130 | 495 | 392 |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 449 | 287 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | 46 | 105 |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 678 | 109 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 153 | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **3 389** | **1 273** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 7 455 | 2 038 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 45 | 39 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 256 | 110 |
| готовая продукция и товары | 214 | 7 154 | 1 889 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 30 855 | 28 404 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 36 | 35 |
| в том числе: курсовые разницы | 231 | - | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 276 | 264 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 14 830 | 6 875 |
| по налогам и сборам в бюджет | 251 | 25 | 471 |
| из нее инновационного фонда Минстройархитектуры | 251a | - | - |
| инвестиционного фонда Минстройархитектуры | 252 | - | - |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 525 | 22 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 4 399 | 3 524 |
| в т. ч. денежные средства на депозитных счетах | 271 | 4 000 | 3 086 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| в том числе недостачи и потери | 281 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **58 376** | **41 162** |
| **БАЛАНС** | **300** | **61 765** | **42 435** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2019 г. | На 31 декабря 2018 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 4 | 4 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 14 502 | 11 096 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **14 506** | **11 100** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 15 252 | 11 416 |
| в т. ч. инновационного фонда Минстройархитектуры | 511 | - | - |
| инвестиционного фонда Минстройархитектуры | 512 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 4 974 | 3 210 |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| в том числе: курсовые разницы | 541 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **20 226** | **14 626** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| в т.ч. инновационного фонда Минстройархитектуры | 611 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 7 150 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 8 765 | 6 308 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 337 | 1 971 |
| по авансам полученным | 632 | 4 460 | 3 559 |
| по налогам и сборам | 633 | 868 | 19 |
| из неё инновационному фонду Минстройархитектуры | 633a | - | - |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 8 | - |
| по оплате труда | 635 | 43 | 34 |
| по лизинговым платежам | 636 | 29 | 90 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 3 020 | 610 |
| в том числе: | | | |
| в бюджет либо РУП «БЕЛСТРОЙЦЕНТР» | 637a | - | - |
| авансовые поступления в счёт вкладов в уставной капитал | 637б | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | - | 25 |
| в т. ч. инвестиционному фонду Минстройархитектуры | 638a | - | - |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | 10 945 | 9 861 |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| в том числе: курсовые разницы | 651 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | 173 | 540 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **27 033** | **16 709** |
| **БАЛАНС** | **700** | **61 765** | **42 435** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2019 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2019 г. | За январь–декабрь 2018 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 5 651 | 5 100 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (2 563) | (865) |
| Валовая прибыль (010 - 020) | 030 | 3 088 | 4 235 |
| Управленческие расходы | 040 | (1 153) | (1 055) |
| Расходы на реализацию | 050 | (16) | (2) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050) | 060 | 1 919 | 3 178 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 10 195 | 18 006 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (3 748) | (524) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 - 080) | 090 | 8 366 | 20 660 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 269 | 242 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 1 | 4 |
| доходы от участия в уставных капиталах других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 268 | 238 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (14) | (15) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (1) | (5) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (13) | (10) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 2 889 | 1 131 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 2 862 | 1 128 |
| из них списанные со счета 98 | 121a | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 27 | 3 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (2 523) | (2 507) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | - | (9) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (2 515) | (2 492) |
| из них списанные со счета 97 | 132a | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (8) | (6) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | 621 | (1 149) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 8 987 | 19 511 |
| Налог на прибыль | 160 | (1 115) | (628) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (1 764) | (2 905) |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | (2) | (6) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (2 700) | (5 333) |
| Прибыль (убыток), перераспределяемые в пределах юридического лица | 205 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 -160 ± 170 ± 180 - 190 - 200 ± 205) | 210 | 3 406 | 10 639 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 3 406 | 10 639 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Д.Г. Заморец
Главный бухгалтер Н.Б. Гусева
21 марта 2020 г.

Организация

# ОАО «Институт «Минскгражданпроект»

Учетный номер плательщика: **600013280.**
Вид экономической деятельности:
**деятельность в области архитектуры.**
Организационно-правовая форма:
**акционерное общество.**

Орган управления: **общее собрание акционеров, наблюдательный совет.**
Единица измерения: **тыс. руб.**
Адрес: **г. Минск, ул. Коллекторная, 20а.**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2019 г.

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2019 | На 31 декабря 2018 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 1 041 | 1 082 |
| Нематериальные активы | 120 | 13 | 11 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 | 2 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **1 055** | **1 095** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 1 297 | 1 087 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 117 | 115 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 1 180 | 972 |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 144 | 217 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 13 | 10 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 3 392 | 2 859 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 152 | 545 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **4 998** | **4 718** |
| **БАЛАНС** | **300** | **6 053** | **5 813** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2019 г. | На 31 декабря 2018 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 40 | 40 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 305 | 300 |
| Добавочный капитал | 450 | 1 953 | 1 955 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 754 | 807 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **3 052** | **3 102** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 35 | 200 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 2 966 | 2 458 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 577 | 535 |
| по авансам полученным | 632 | 1 632 | 1 303 |
| по налогам и сборам | 633 | 582 | 403 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 55 | 60 |
| по оплате труда | 635 | 116 | 153 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 4 | 4 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | 53 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **3 001** | **2 711** |
| **БАЛАНС** | **700** | **6 053** | **5 813** |

Руководитель О. М. Быковский
Главный бухгалтер Е. А. Игнатьева
31 марта 2020 г.

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2019 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2019 г. | За январь– декабрь 2018 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 8 405 | 7 345 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | -7818 | -6870 |
| Валовая прибыль | 030 | 587 | 475 |
| Управленческие расходы | 040 | - | - |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 587 | 475 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 24 | 32 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | -377 | -351 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 234 | 156 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 26 | 38 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставных капиталах других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 26 | 38 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - 4 | - 6 |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - 4 | - 6 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 5 | 3 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 5 | 3 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | -59 | -39 |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | -36 | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | -10 | - 6 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | -13 | -33 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | -32 | -4 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 202 | 152 |
| Налог на прибыль | 160 | -91 | -78 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 111 | 74 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 111 | 74 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

## Информация открытого акционерного общества «Институт «Минскгражданпроект» по итогам 2019 года

1. Количество акционеров – всего 373, из них: физических лиц – 371, юридических лиц – 1 (резидент РБ), государство – 1.
2. Доля государства в уставном фонде эмитента – 25 % акций.
3. Все акции – простые.
4. В 2019 году выплата дивидендов за текущий год не осуществлялась.
5. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором принято к сведению аудиторское заключение, утверждены: годовой отчет, бухгалтерский баланс за отчетный 2019 год – 31 марта 2020 года.
6. Из заключения аудитора – ООО «АудитКомСервис»:

«По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Институт «Минскгражданпроект» на 31 декабря 2019 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

7. По результатам голосования общего собрания акционеров принято решение о начислении дивидендов по результатам 2019 года из расчета 0,13 рубля на одну акцию.
8. Дивиденды будут выплачены: государству путем перечисления на расчетный счет в срок до 10 апреля 2020 года; юридическому лицу на расчетный счет в срок до 30 апреля 2020 года; физическим лицам, имеющим карт-счета, на карт-счета до 30 апреля 2020 года и физическим лицам, не имеющим карт-счетов, из кассы предприятия (по месту нахождения юридического адреса) в срок с 21 по 23 апреля 2020 года.

# СПРУТ НА АПЕНІНАХ

## Навошта італьянская мафія зніталася з каранавірусам?

**У Італіі надзвычайная сітуацыя складваецца не толькі ў бальніцах. Улады асцерагаюцца, што на поўдні краіны могуць паўстаць маштабныя хваляванні, якія справакуе мафія. Пра гэта піша іспанская газета ABC. Рымскі карэспандэнт выдання спасылаецца на канфідэнцыяльную, падрыхтаваную спецыяльна для прэм'ер-міністра Італіі Джузепе Контэ і міністра ўнутраных спраў краіны Лучаны Ламарджэзе справаздачу, у якой адзначаецца, што на поўдні Італіі «існуе патэнцыйная небяспека стыхійных і арганізаваных паўстанняў». Як італьянская мафія зніталася з каранавірусам?**



### ПАНУЕ ХАОС

З-за эпідэміі каранавіруса ў сакавіку ўжо адбываліся бунты ў італьянскіх турмах: у міланскай «Сан Віторыа» і рымскай «Рэбібіі», а таксама ў месцах зняволення ў Салерна, Неапалі, Бьеле, Алесандрыі, Фоджэ, Павіі і іншых італьянскіх гарадах. У некаторых турмах зняволеныя ў знак пратэсту спрабавалі захапіць мясцовыя медыцынскія ўстановы. Пра небяспечную сітуацыю паведамляюць газеты поўдня Італіі. «Джарнале дзі Січылія» піша, што ў горадзе Трапані пануе хаос, урачы мясцовага шпіталя Паола Барселіна дзі Марсала паскардзіліся ў пракуратуру, што ў іх не хапае масак, а хворыя на каранавірус медыкі вымушаныя хадзіць на работу.

Не вытрымліваюць напружання ў гэтай абстаноўцы нават вядучыя італьянскія палітыкі. Так, былы віцэ-прэм'ер і лідар самай папулярнай цяпер у краіне партыі «Ліга» Матэа Сальвіні прыгразіў выхадам з ЕС. Выступаючы па тэлебачанні і каментуючы бяздзейнасць Еўрасаюза, ён у гневе ўсклікнуў: «Еўропа? Гэта зусім не «саюз», гэта гняздо змей і шакалаў. Спачатку мы пераможам вірус, а потым падумаем пра Еўропу. І, калі трэба, развітаемся».

Гэтыя беспрэцэдэнтна рэзкія заявы лідар «Лігі», якая, па ўсіх прагнозах, цяпер у топе апытанняў грамадскай думкі па папулярнасці, зрабіў пасля правалу нарады 27 кіраўнікоў краін ЕС у фармаце відэаканферэнцыі. На гэтай нарадзе Джузепе Контэ адхіліў праект выніковага дакумента адносна мер па пераадоленні наступстваў эпідэміі. Італьянскі прэм'ер запатрабаваў знайсці «адэкватнае рашэнне, якое адпавядае вастрыні надзвычайнай сітуацыі».

### «НЯМА ГРОШАЙ, А ТРЭБА ЕСЦІ»

Людзям элементарна не хапае грошай на ежу, яны апасаюцца голаду ці ўжо галадаюць, адзначае газета ABC. Сітуацыя ўскладняецца тым, што, паводле звестак прафсаюзаў, у Сіцыліі кожны трэці нелегальна працаўладкаваны — па «чорных схемах». Паводле ацэнак, усяго ў ценявой эканоміцы паўднёвай Італіі занята амаль чатыры мільёны чалавек. Такія работнікі асабліва ўразлівыя ў цяперашняй сітуацыі, каранцін пазбаўляе іх сродкаў да існавання.

У Палерма група з 20 чалавек у супермаркеце набіла каляскі прадуктамі і адмовілася разлічвацца, выкрыкваючы: «Хопіць сядзець дома, у нас няма грошай, каб заплаціць, нам трэба есці». У сацыяльных сетках распаўсюджваюцца заклікі да рабавання крам пад лозунгам «забраць назад тое, што ў нас узята». Вылучаюцца патрабаванні: «Дзяржава павінна даваць нам ежу і аплаціць арэндную плату».

«Існуе патэнцыйная небяспека бунтаў і паўстанняў, стыхійных і арганізаваных, асабліва на поўдні Італіі, дзе ценявая эканоміка і шырокая прысутнасць арганізаванай злачыннасці з'яўляюцца аднымі з асноўных фактараў рызыкі», — адзначаецца ў справаздачы службаў бяспекі прэм'ер-міністру і міністру ўнутраных спраў, якую цытуе ABC.

Міністр па справах паўднёвых рэгіёнаў Італіі Пепі Правенцана заявіў у інтэрв'ю італьянскай газеце La Repubblica пра неабходнасць звярнуць увагу на поўдзень, бо «ён можа падарвацца». «Трэба дзейнічаць хутка. Неабходна распаўсюдзіць гарантаваны даход (на большую частку насельніцтва. — **«Зв.»**)», — перакананы Правенцана.




Мэры шэрагу гарадоў на поўдні Італіі асцерагаюцца, што рабаванні і падбухторванні да гвалту, якія пакуль што стрымліваюцца, могуць абярнуцца сацыяльнымі хваляваннямі. У Палерма і іншых гарадах Сіцыліі паліцыя ўзяла пад ахову супермаркеты. Не праходзіць амаль ні дня без таго, каб у паўднёвай Італіі не адбыўся напад на аптэку. Мэр Палерма Леалука Арланда з гэтай нагоды заўважыў, што «побач з тымі, хто перажывае крызіс у трывозе, але з годнасцю, ёсць групы шакалаў і прафесійных бунтаўшчыкоў, якія падбухторваюць да гвалтоўных дзеянняў, персанажы і групы, што з гонарам заяўляюць пра сваю датычнасць да мафіі». Арланда заклікаў паведамляць пра іх у паліцыю.

Мэр Неапаля Луіджы дэ Маджыстрыс не хавае — цяжкая сітуацыя на руку мафіёзным структурам: «У іх велізарныя сумы наяўных. Я не кажу, што іх больш ці столькі ж, колькі ў дзяржавы. Але мафія вельмі хутка знаходзіць ім прымяненне. Дзяржава людзям усё яшчэ не выплаціла кампенсацыі, прадугледжаныя сакавіцкім указам. А для мафіі і трох гадзін дастаткова».

### ЧАС ГАМОРЫ

«Даходы італьянскай мафіі павялічацца на фоне пандэміі каранавіруса ў краіне, таму што босы-мафіёзі выкарыстоўваюць новыя магчымасці для бізнесу і адаптуюць свае сеткі па распаўсюджванні наркотыкаў», — піша брытанская газета The Telegraph. «Падчас пандэміі сектары рынку, якія кантралююць італьянскія мафіёзныя арганізацыі, пашыраюцца, — паведаміў выданню Раберта Савіяна, аўтар бестселера — рамана-рэпартажа «Гамора», у якім падрабязна апісваецца дзейнасць неапалітанскай злачыннай групоўкі «Камора». — Мафія патроіць свой прыбытак ад усяго гэтага, таму што сектары, у якія яны інвеставалі і якія яны цяпер кантралююць у многіх галінах, пашыраюцца». «Мяркуецца, што мафіёзныя групы прадаюць у даркнэце медыцынскія маскі, якія першапачаткова прызначаліся для бальніц, а таксама аказваюць уплыў на пастаўку прадуктаў. Іх абарот ацэньваецца ў 120 мільярдаў еўра ў год, — адзначае выданне. — Да таго як у пачатку сакавіка былі ўведзены меры па блакіраванні, наркадылеры, звязаныя з мафіяй, маглі прадаваць свае старыя запасы па высокіх цэнах, і мафія рыхтуецца да какаінавага буму, калі людзі выйдуць з каранціну».

«Калі пачаўся крызіс, яны маглі прадаваць усе віды наркотыкаў, нават свае старыя запасы, па цэнах, якія перавышаюць сярэднія, таму што людзі рабілі запасы, — заўважае Савіяна. — Марыхуана і гераін з'яўляюцца найбольш спажыванымі наркотыкамі ў часы калектыўнай трывожнасці. Аднак пасля заканчэння крызісу больш запатрабаваны стане какаін. Адсутнасць праверак у партах падчас пандэміі азначае, што какаін можна будзе завезці лягчэй. Яго перавозка будзе на самым высокім узроўні за ўсю гісторыю».

«Наркагандляры, звязаныя з мафіяй, ужо ўхіляюцца ад жорсткіх абмежаванняў на перамяшчэнні, уведзеных для італьянцаў, выдаючы сябе за разносчыкаў піцы, — паведаміў нацыянальны пракурор па барацьбе з мафіяй Нікола Гратэры. — Рознічны гандаль какаінам запаволіўся, таму што гарады знаходзяцца на каранціне, але цяпер гандляры наркотыкамі ў італьянскіх гарадах пераадзяваюцца ў дастаўшчыкаў ежы і прывозяць наркотыкі на дом». Таксама прадракаюць хвалю звязаных з мафіяй вымагальніцтваў з прычыны фінансавай катастрофы, выкліканай вірусам. «Закрыццё рэстаранаў, гатэляў і піцэрый будзе мець разбуральныя наступствы, — адзначае Гратэры. — Калі грошы не паступяць ад дзяржавы ў найбліжэйшы час, многія пацерпяць крах. І каб не прагарэць, уладальнікі бізнесу могуць звярнуцца да крымінальных арганізацый, якія выкарыстоўваюць грошы ад продажу какаіну для выдачы крэдытаў і ліхвярства».

«Пасля фінансавага крызісу 2008 года італьянскія злачынныя арганізацыі праявілі сябе, выкарыстоўваючы свае велізарныя запасы капіталу для выкупу і «выратавання» кампаній, якія ішлі да дна. Многія прадказваюць, што тое ж самае адбудзецца, калі пандэмія скончыцца», — адзначае The Telegraph. Нікола Мора, сенатар і старшыня парламенцкай камісіі па барацьбе з мафіяй, заявіў, што мафія абавязкова прапануе крэдыт і капітал прадпрымальнікам, якія змагаюцца з пандэміяй. Так было і падчас фінансавага крызісу 2008 года. Італіі давядзецца мець справу са злачыннымі арганізацыямі, і як урад мы павінны зрабіць усё магчымае, каб змагацца з гэтым.

### СУР'ЁЗНЫЯ СІГНАЛЫ

Па звестках ABC, заклікі да паўстання пасля 13 красавіка, калі павінны скончыцца жорсткія абмежавальныя меры, гучаць у сацсетках, дзе распаўсюджваюцца ролікі з патрабаваннямі «вайны». «Меры супраць эпідэміі каранавіруса, якія прыняў урад (маецца на ўвазе жорсткі каранцін. — **«Зв.»**), падпалілі кнот бомбы, што можа падарвацца, асабліва ў тых раёнах, дзе крызіс ужо даўно пусціў глыбокія карані», — канстатуе міланская il Giornale і адзначае, што на поўдні краіны з'явілася «пагроза паўстання і рабаванняў».

Як сведчаць СМІ, урад успрыняў гэтыя сігналы сур'ёзна. Кіраўнік італьянскай паліцыі Франка Габрыэла папярэдзіў міністра ўнутраных спраў Лучану Ламаргезе, якая, у сваю чаргу, неадкладна паведаміла пра гэта кіраўніку кабінета міністраў. У інтэрв'ю тэлекампаніі Skyg24 Ламаргезе заявіла, што яна «заклапочаная сітуацыяй, якая складаецца ў краіне». А прэм'ер-міністр Джузепе Контэ заклікаў забяспечыць «харчовую салідарнасць». «Пасланне ўрада яснае, — піша il Giornale, — даць магчымасць закупак прадуктаў харчавання, каб забяспечыць асноўныя патрэбы». А Ламаргезе без хітрыкаў прызнала, што ў ахопленых хваляваннямі раёнах узнікла пагроза голаду. «Калі скончаецца дзень, трэба мець магчымасць даць паесці ўласным дзецям, і мы павінны гэта ўлічваць», — заўважыла міністр унутраных спраў. Пры гэтым яна дадала, што стаўленне да «незаконных паводзін» ні ў якім выпадку не будзе памяркоўным.

На думку экспертаў, асаблівасць Італіі — тое, што палітычная карупцыя стала фактычна неаддзельная ад мафіі. А тая ператварылася ў адзін з сімвалаў Італіі, нягледзячы на ўсе спробы краіны перашкодзіць гэтаму. Найноўшая гісторыя Апенін — бескампрамісная барацьба супраць зніто́ўвання крыміналу і палітыкі. Барацьба, у якой былі не толькі няўдачы, але і сур'ёзныя перамогі. Цяпер чарговы раз настаў час тэста «на спрута».

**Захар БУРАК.**

## Тры сталічныя кінатэатры закрыліся для гледачоў

**Сетка «Кінавідэапракат» з 2 красавіка прыпыніла кінапаказы ў трох найбуйнешых кінатэатрах — Доме кіно, «Кастрычнік» і «Масква», пры гэтым астатнія пляцоўкі працуюць у штатным рэжыме.**

«У сувязі з тым, што сышло шмат буйных сусветных рэлізаў і наведвальнасць кінатэатраў упала, з меркаванняў эканамічнай мэтазгоднасці было прынята рашэнне з 2 красавіка не дэманстраваць кіно на названых пляцоўках, бо гэта вялікія кінатэатры, амаль тысячнікі, — кажа намесніца генеральнага дырэктара «Кінавідэапраката» Кацярына Багданава. — Але як толькі чаканыя прэм'еры вернуцца, кінатэатры працягнуць сваю работу ў штатным рэжыме».

Калі звычайна сетка кожны чацвер прадстаўляе 4-5 новых фільмаў, то праз сітуацыю з распаўсюджаннем COVID-19 аднаўляць рэпертуар ёй стала складана, таму апроч рэдкіх прэм'ер у праграму ўключаюцца карціны, што ў пракаце ўжо былі.

Суразмоўніца кажа, што пакуль новыя фільмы не выходзяць, старыя вычарпалі свой патэнцыял: «Джэнтльмены» і «Бладшот» ідуць вельмі даўно — шмат людзей ужо пабачыла, паўторна на гэтыя фільмы ніхто не пойдзе, увогуле глядзець аўдыторыі цяпер асабліва няма чаго». Далейшая работа сеткі, па словах спадарыні Кацярыны, будзе залежаць ад таго, наколькі хутка вернуцца буйныя рэлізы.

У якасці мер перасцярогі ў кінатэатрах павялічаны інтэрвалы паміж сеансамі, праводзіцца рэгулярнае праветрыванне кіназалаў, пасля кожнага паказу крэслы апрацоўваюцца дэзінфекцыйнымі сродкамі, а ў фае знаходзяцца антысептыкі.

Не выключана, што ў найбліжэйшы час сетцы «Кінавідэапракат» ды іншым кінатэатрам давядзецца зусім адмяніць кінапаказы.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

Кінакрокі

## БЕЛАРУСКІ ПЕРЫЯД ВАЛЕРЫЯ РУБІНЧЫКА

**Аднаго з самых арыгінальных беларускіх рэжысёраў можна ўбачыць на вялікім экране — 2 красавіка ў Музеі гісторыі беларускага кіно з нагоды блізкага 80-годдзя распачалася цэлая рэтраспектыва Валерыя Рубінчыка. Тут і «Апошняе лета дзяцінства», і «Вянок санетаў», і «Дзікае паляванне караля Стаха» — неад'емныя часткі айчыннага фільмафонду будуць паказвацца ў кіназале музея да 30 красавіка.**


«Дзікае паляванне караля Стаха».

Рэжысёр, якога, дарэчы, ва УДІКе называлі Фелінчыкам, доўгі час працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм» і нават быў яе мастацкім кіраўніком, хоць урэшце і з'ехаў у Маскву, дзе стаў здымаць на «Масфільме» і выкладаць у сваёй жа альма-матар.

Для беларускага кінематографа, тым не менш, фігура Валерыя Рубінчыка беспрэцэдэнтная і неаспрэчна «класічная» — ужо ў «Магіле льва» 1971 года ён звярнуўся да спадчыны Янкі Купалы і беларускіх народных легендаў. Праз некалькі гадоў пайстаў яго тэлефільм «Апошняе лета дзяцінства» — аповед пра трох камсамольцаў у часы НЭПа, што праяўляюць сябе паралельна з расследаваннем забойства інжынера Зіміна ў іх двары. У адзначаным міжнароднымі ўзнагародамі «Вянку санетаў» па матывах аповесці Віктара Мураватава і з вершамі Бэлы Ахмадулінай гаворка пайшла пра апошнія месяцы вайны — праз падлеткаў музычнага ўзвода.

Нарэшце, самай, напэўна, важкай і ўшанаванай кінафестывалямі (у Італіі, Канадзе, Бельгіі і іншых краінах) стала стужка «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле Уладзіміра Караткевіча, дзе народныя паданні, XIX і XX стагоддзі агарнуліся ў жанр містычнага трылера і цяпер ужо аднаго з самых вядомых беларускіх фільмаў.

Рэтраспектыва ўключае таксама камедыю «Культпаход у тэатр», дакументальную работу «Мастак Барыс Забораў» і зняты сумесны з ФРГ і Аўстрыяй фантастычны дэтэктыў «Адступнік», таксама адзначаны міжнароднымі кінафэстамі.

Праграма абмяжоўваецца фільмамі, якія Валерый Рубінчык стварыў у Беларусі і для Беларусі: пасля пераезду ў Маскву ў рэжысёра былі «Камедыя пра Лісістрату», «Нелюбоў» і «Нанкінскі пейзаж», але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

Кінапаказы ў музеі суправаджаюцца хранікальна-дакументальным матэрыялам пра рэжысёра.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

## Саўлюс ВАРНАС:

# «Мы ўсе — маленькія багі гэтага свету»

**Яшчэ адзін варыянт п'есы Эжэна Іанеска «Смага і голад» — рэжысёр Саўлюс Варнас чарговы раз узяўся за твор франка-румынскага драматурга і ў мінскім Маладзёжным тэатры прадставіў спектакль «Дом пасярод вясны». Аўтара, якога беларускі глядач ведае па рабоце галоўным рэжысёрам Магілёўскага драматычнага тэатра, заўсёды вылучалі асаблівае бачанне і стыль — яго работы былі адзначаны Нацыянальнай тэатральнай прэміяй і прадстаўлялі беларускі тэатр на міжнародных фестывалях, а п'еса Іанеска была асновай для майстар-класаў Варнаса ў розных краінах свету.**


mdrama.by

***— Чым вас так вабіць Іанеска, што вы гатовы бясконца ставіць адну і тую ж яго п'есу?***

— «Смага і голад» — адна з найлепшых п'ес ХХ стагоддзя, яна ўзнімае пытанні, на якія чалавек шукае адказы на кожным этапе свайго развіцця. Да таго ж яна настолькі змястоўная і тэатральная, што раскрыццё сэнсаў і пошук сцэнічнай мовы можа быць бясконцае. Яе ўвогуле можна вывучаць усё жыццё і ўсё роўна не вычарпаць да канца. Эжэн Іанеска — гэта асобны свет, у яго асаблівае разуменне тэатра і погляд на рэчаіснасць, у яго драматургіі шмат гульнявой прасторы, ён дае магчымасць выйсці за межы сюжэта і раскрыць тое, што знаходзіцца паміж радкамі. Гэтая няпростая матэматыка патрабуе ад кожнага, хто адважыўся пусціцца ў плаванне, задзейнічаць асабісты досвед — кожны раз, выходзячы на сцэну, акцёрам даводзіцца спальваць сябе на гэтым вогнішчы. З майго пункту гледжання гэта самая прыгожая і гуманістычная п'еса, якая дазваляе аб'яднацца ў разважанні аб тым, што такое жыццё, шчасце і барацьба за ідэалы. Па адказы мы звычайна ідзём у храмы альбо звяртаемся да мастацтва — адным словам, прыходзім да тых, хто апелюе да вышэйшай свядомасці. А Карл Ясперс пісаў, што калі вы прыходзіце да нейкіх адказаў, перакрэсліце іх і пачніце шукаць наноў. Гэты рух — і ёсць задача, дзеля якой варта акунуцца ў свет мары, фантазіі, ілюзій, сноў, надзей гэтай п'есы.

***— Ваша трактоўка ў Маладзёжным тэатры можа збянтэжыць рознастылёвасцю і мудрагелістымі вобразамі, якія з'явіліся ўжо па-за тэкстам.***

— Эжэн Іанеска казаў, што ісціна ў нашых марах і нашым уяўленні. Яго спроба паказаць, як свет фарміраваўся на працягу тысячагоддзяў, прымушае задумацца, навошта мы ў гэты свет увогуле прыйшлі. Гэта нібы падарожжа Адысея або пошукі Фаўста. Кожны з герояў Іанеска жадае знайсці свой рай, таму п'еса ўмяшчае розныя архетыпы і погляды на свет. Галоўны герой Жан, напрыклад, адчувае патрэбу кінуць паўсядзённае сямейнае жыццё, дзе носіцца з усімі яго капрызамі, і сыходзіць па сваю мару. Ёсць шмат філасофскіх школ, якія быццам прыадкрываюць таямніцы свету, але многія адказы можна знайсці, сустрэўшыся з жыццём сам-насам. Поль Валеры пісаў: «Пакуль чалавек не захацеў стаць Богам, ён яшчэ не Чалавек». Стаць Богам — значыць адчуць у сабе радасць ад таго, што ты робіш альбо ствараеш і прыўносіш у свет тое, чаго ў ім не было раней альбо чаго было недастаткова. Мы ўсе — маленькія багі гэтага свету. Я назіраў у дзяцінстве, як бацька робіць чарцяжы і стварае па іх мэблю, якой захапляліся і майстры, і тыя, для каго яна выраблялася, — я бачыў, у якой цішыні нараджаюцца думкі, як бацька паглыбляецца ў справу і на нейкі час нібыта знікае, бо для яго быў важны толькі працэс стварэння. Тады я зразумеў, што думка нараджаецца ў цішыні і як важна любіць тое, што робіш. Пры гэтым трэба, каб нашы памкненні былі чыстыя, каб намі рухала любоў да справы і да навакольнага свету.

***— Сёння тэатр мяняецца, прыстасоўваючыся пад патрэбы чалавека. А вы ствараеце складаныя спектаклі, дзе шмат постмадэрнісцкіх адсылак, алегорый, рэмінісцэнцый. Верыце ў здольнасць тэатра прымусіць чалавека пераасэнсаваць жыццё?***

— Ёсць будысцкая прытча. У аднаго прасветленага спыталі: «А што вы рабілі да таго, як сталі прасветленым?» Той адказаў: «Насіў ваду і калоў дровы». — «А што вы робіце пасля таго, як сталі прасветленым?» — «Нашу ваду і калю дровы». — «Дык што тады змянілася?» — «Змянілася ўсё». Змяніўся яго погляд на свет — і сам свет для яго змяніўся. Усё ў нашым розуме: на любую рэч мы можам глядзець як станоўча, так і адмоўна, часта гэта залежыць ад нашага настрою. Чалавек можа ныць па працягу ўсяго жыцця — нарадзіўся не там, не ў той сям'і, не ў той час — і з адчуваннем уласнага няшчасця пакінуць гэты свет, так і не пачаўшы жыць. А можа ствараць свет, прыўносіць тое, чаго яму не хапае. Скандынавы шмат гадоў вялі даследаванні, каб знайсці адказ на пытанне, што можа змяніць абывацельскае мысленне перанасычанага спажывецкага свету, і прыйшлі да высновы, што толькі мастацтва. Думаю, у першую чаргу тэатральнае: жывое хутчэй паўплывае на жывых. Але трэба змяніцца і самому тэатру: адысці ад плоскіх камедый, перастаць размаўляць з гледачамі на гарызантальным узроўні. На жаль, за рэдкім выключэннем рашэнні ў творчых калектывах прымаюць адміністратары — менеджары, якія не асабліва думаюць пра мастацтва.

***— Што б вы пажадалі гледачам?***

— Адкрытасці і ўнутранай цішыні. Ідучы ў тэатр, трэба быць разняволеным і гатовым сустрэцца з іншасветам з яго камедыйнасцю, гратэскам, абсурдам. Трэба разумець, што асаблівую ролю адыгрываюць колер, святло, тэхнічныя эфекты, а ў першую чаргу акцёры са сваімі целам, голасам, пластыкай. А рэжысёру трэба прыкласці ўсе намаганні, каб ствараць свет, які мяняў бы свет гледачоў, а ў выніку наш агульны. Веру, што спектакль «Дом пасярод вясны» не пакіне гледачоў абыякавымі. Рэакцыі могуць быць розныя, але абыякавымі людзі не застануцца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

«Дом пасярод вясны».

Фота дадзена Маладзёжным тэатрам.

# «Корпус», Ок16 ці галерэя «Ў» — культурным пляцоўкам патрэбна дапамога

**Культурныя арганізацыі і праекты, што праз распаўсюджанне каранавіруса страцілі наведвальнікаў, але не страцілі рахункі, якія трэба аплачваць, звярнуліся па дапамогу да звычайных людзей. Паколькі работа ў штатным рэжыме цяпер для іх немагчымая, на фандрайзінгавай платформе Molamola адкрылася кампанія па зборы сродкаў #АртПраязны, праз якую любы чалавек можа фінансава падтрымаць канкрэтныя культурныя цэнтр ці праект. Гаворка нярэдка ідзе не толькі пра падтрыманне арт-пляцовак у час, калі яны не могуць зарабляць грошы сваёй непасрэднай дзейнасцю, але і пра выратаванне іх ад закрыцця.**


www.tripadvisor.ru

Вядомаму культурнаму цэнтру **«Корпус»,** каб аплаціць месячную арэнду памяшкання на праспекце Машэрава, камунальныя і эксплуатацыйныя рахункі, неабходна сабраць 10 тысяч рублёў (ад сумы трэба адняць працэнт, які адлічваецца фандрайзінгавай платформе). «Гэтая сума не ўключае ў сябе заробкі альбо падтрымку памяшкання ў чысціні — яна патрэбная проста для таго, каб цэнтр не адключылі ад камунікацый і не забралі за нявыплату», — кажа заснавальнік і арт-дырэктар «Корпуса» Аляксандр Багданаў.

«Корпус» перанёс каля сарака запланаваных мерапрыемстваў: яшчэ да таго, як COVID-19 стаў распаўсюджвацца, графік культурнага цэнтра быў распісаны да канца чэрвеня. Цяпер усе супрацоўнікі, апроч трох кіраўнікоў, адпушчаны ў неаплатныя адпачынкі. Між тым пляцоўка рыхтуе відэашоу, тэсціруе відэатрансляцыі вечарын «Нядзеля» і плануе перавесці лекцыі «Корпус гаворыць» у анлайн-фармат, да таго ж складае графік мерапрыемстваў на лета і восень — у яго таксама ўвойдуць канцэрты культавага клуба «Бругге», які вымушаны быў закрыцца якраз праз немагчымасць выканаць арэндныя абавязкі з-за страты наведвальнікаў.

Фінансавыя абавязкі сталі складанасцю і для **галерэі сучаснага мастацтва «Ў»,** якой таксама патрабуецца сабраць 10 тысяч рублёў. «Гэта той мінімум, з якім мы зможам хоць неяк застацца на плаве і не дазволіць нашай прасторы растварыцца ў прасторы. Гэтыя грошы дазволяць нам несці расходы па падтрыманні галерэі і закрыцці фінансавых абавязкаў, не пазбавіцца натхнення і аптымізму і пасля заканчэння гэтага нялёгкага перыяду сустрэцца з вамі ўсімі на выставах, лекцыях і дыскусіях», — гаворыцца ў звароце каманды да патэнцыйных данатараў.

Прастора **«Другі паверх»** знаходзіцца ў тым жа будынку, што і «Корпус». На яе патрэбы — усё тыя ж арэндныя, камунальныя і эксплуатацыйныя плацяжы — у рамках акцыі #АртПраязны трэба сабраць тры тысячы рублёў, а найбуйнейшая частка гэтай сумы мусіць пайсці за арэнду да 5 красавіка.

«Мы не чакаем, што збяром поўную суму, але нават яе частка нам дапаможа, — кажа сузаснавальніца і арт-менеджар «Другога паверха» Дар'я Скараходкіна. — Мы таксама думаем, што можам рабіць у гэтых умовах. Магчыма, мы запусцім відэасалон для аднаго ці для сям'і: тыя, хто ўжо стаміўся сядзець дома, — а масавых мерапрыемстваў папросту няма — змогуць прыйсці да нас і паглядзець фільм на вялікім экране і ў добрай якасці. Альбо папрацаваць — такі каворкінг на аднаго. Паспрабуем прасунуць гэтыя ідэі і паглядзім, якая будзе рэакцыя».

Каманда прасторы складае два чалавекі і ўсе надзённыя пытанні пакуль вырашае ў анлайн-рэжыме. «Апошнім часам з нашай аўдыторыяй мы камунікуем анлайн і неяк нават не чакалі, што з яе боку атрымаем такую падтрымку — людзі не толькі пералічваюць грошы на нашу кампанію на Molamola, але і шмат пішуць нам».

Каманда культурнага хаба **Ок16,** што на вуліцы Кастрычніцкай, у гэтыя дні на 90 працэнтаў працуе дыстанцыйна, але ў тым жа рэжыме. «Цяпер мы займаемся пытаннямі, на якія раней не было часу, — у нас з'явілася магчымасць вывучыць рынак і досвед калег і прыдумаць, як гэта скарыстаць у далейшым, — кажа арт-дырэктар Ок16 Марыя Калеснікава. — Якраз такія складаныя перыяды стымулююць адкрываць новыя гарызонты і даведвацца пра нешта новае».

Праз удзел у акцыі #АртПраязны культурны хаб канцэнтруецца на адраснай падтрымцы калег — мастакоў, музыкантаў, акцёраў, з якімі супрацоўнічае ўвесь час. На платформе Molamola ён разлічвае сабраць 1550 рублёў, а тым часам шукае новыя спосабы займацца мастацтвам.

«Мы адкрылі Youtube-канал, які будзе запаўняцца работамі нашых артыстаў — інтэрв'ю, запісамі пастановак, перформансаў і канцэртаў, — і актыўна развіваем свой Telegram-канал. У такіх умовах апроч вось такіх кампаній, як #АртПраязны, дзе мы атрымліваем грошы праз тое, што гараджане разумеюць каштоўнасць нашай працы і падтрымліваюць яе, другой магчымасцю зарабіць можа быць манетызацыя Youtube- і Telegram-каналаў, але, канешне, гэта няблізкая перспектыва», — дзеліцца Марыя.

У акцыі #АртПраязны апроч згаданых удзельнічаюць пляцоўка «Арт Сядзіба», праекты ARTONIST, VEHA, ZNYATA ды іншыя. Падтрымаць іх можна на фандрайзінгавай платформе molamola.by, дзе ўсе кампаніі сабраныя ў асобную ўкладку. Апроч гэтага ў Instagram дзейнічае падобная акцыя #АртНаКарантине, дзе апублікавана больш за восемсот работ, якія можна набыць па зніжанай цане.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

На сцэне

# ВУСАТЫ ФЕНІКС ОПЕРНАГА РЭПЕРТУАРУ

## Упершыню за пяць гадоў: рэцэнзія на новую дзіцячую оперу Вялікага



**Дзіцячымі операмі нашага гледача не песціць: апошні раз на новую назву маладое пакаленне запрашалі пяць гадоў таму. Сакавік пераламіў сітуацыю: Вялікі тэатр выпусціў пастаноўку для самых маленькіх «Кошчын дом» на музыку Паўла Вальдгарта. Аднак на ўнікальнасць гэты спектакль можа прэтэндаваць не толькі па факце свайго з'яўлення. На першых пасля прэм'ерных выхадаў паказах можна самім паглядзець, як рэжысёр Дар'я Пататурка і мастак Кацярына Шымановіч дапамагаюць дзецям на свае вочы ўпэўніцца, што опера можа быць такая ж крутая, як любы навамодны мультсерыял.**

У падмурку новай оперы Вялікага вядомая казка Самуіла Маршака «Кошчын дом». Вакол Кошкі круцілася шмат прыхвасняў, гатовых усхваляць багатую гаспадыню, у якой былі надзвычайныя цікавінкі, напрыклад, такія невядомыя казачным звярам «гаджэты», як люстэркі. Аднак яны закрылі свае дзверы ад былой сяброўкі, як толькі ў той здарылася бяда. У гісторыі пра міласэрнасць і ўменне дараваць крыўды тым, каму патрэбна дапамога (як памятаем, выратавалі няшчасную тыя пляменнікі, якіх яна калісьці і на парог дома не пушчала) шмат аўдыя- і мультыплікацыйных версій. Гэта значыць, што ў глядачах, якія любяць выбіраць для сямейных паходаў знаёмыя назвы, дакладна нястачы не будзе.

Радуе, што ў якасці мастака-пастаноўшчыка тэатр нарэшце запрасіў Кацярыну Шымановіч, якая колькі гадоў працуе ў штаце Опернага, аднак аўтарскія заказы ў асноўным атрымлівае па-за роднымі падмосткамі. Даверыўшыся маладой мастачцы, наш Вялікі атрымаў нязвыклую для айчыннай оперы, але надзвычай гаваркую сцэнаграфію.

У сваіх творчых пошуках спадарыня Кацярына пайшла ад светаадчування дзіцяці. Калі на афішы ставіцца ўзроставы цэнз 0+, то натуральным выглядае вырашэнне сцэнаграфіі ў выглядзе канструктара для самых маленькіх. Мастачка, гуляючы, ператварае шары ў сонца, трохкутнікі — у дахі і элементы інтэр'ераў, паўсферы — то ў арэлі, то ў крэслы, а звычайны прамавугольнік — пры дапамозе відэапраекцыі ад Сяргея Навіцкага — у піяніна. Нават пажар спадарыня Шымановіч малюе не чырвонымі языкамі полымя, якіх чакаюць дарослыя, а чорнымі штрыхаванымі лініямі: менавіта так робяць самыя маленькія, калі адлюстроўваюць тое, чаго палохаюцца. «Кошчын дом» будуецца на чысціні белага і блакітнага, на гарэзлівасці жоўтага, зялёнага і ружовага ды спалучэннях так любімых Кацярынай мятнага і ажынавага колераў. Такое каларыстычнае вырашэнне дапамагае выхоўваць густ малечы, а прастата сцэнічных формаў спрыяе развіццю фантазіі.

Мастачка разам з рэжысёрам Дар'яй Пататурка адмовілася ад традыцыйнага рашэння прычапіць усім артыстам вушы і хвасты. Акцёры выходзяць у забаўных аб'ёмных касцюмах, а зразумець, хто ёсць хто, дапамагаюць лялькі. На маёй памяці так актыўна на сцэне Опернага яны выкарыстоўваюцца ўпершыню. Усе галоўныя персанажы — планшэтныя лялькі ў рост чалавека, якіх салісты катаюць на спецыяльных платформах на колах. Парсючкоў, куранят і кацянят зрабілі на трысцінах, а хор надзялілі плоскаснымі лялькамі. Над імі працавала некалькі творчых камандаў, у тым ліку да стварэння паклікалі выдатнага мастака-бутафора з Тэатра лялек Алега Нікалайчыка.

Салістам відавочна падабалася гульня ў казку, мо таму вобразы, знойдзеныя Аленай Бундзелевай, Андрэем Кліпо, Настассяй Кардаш, Юрыем Балоцькам ды іншымі, адразу знаходзілі водгук у зале. Таксама з'явілася магчымасць паказаць сябе на поўную моц і дзеючаму пры Вялікім Дзіцячаму музычнаму тэатру-студыі пад кіраўніцтвам Алены Няронскай: менавіта яе выхаванцы выбягаюць на сцэну ў вобразах няўрымслівых нашчадкаў некаторых галоўных герояў.

Для Дар'і Пататурка вакальная казка — доўгачаканы рэжысёрскі дэбют (да гэтага яна працавала асістэнтам оперных рэжысёраў і ставіла гала-канцэрты на роднай сцэне). Таму часам бракавала арыгінальнасці малюнку пэўных мізансцэн, не заўсёды атрымлівалася вытрымліваць тэмпарытм дзеяння і па максімуме выкарыстаць магчымасці, закладзеныя ў сцэнаграфіі. І ўсё ж абраны ёй сінтэз розных відаў тэатральнага мастацтва дапамог спектаклюператварыцца ў дынамічнае відовішча, а яно да таго ж, прыцягнуўшы ўвагу формай, лягчэй навучыць дзяцей слухаць арыі, каб пазней перайсці да больш складаных музычных твораў.

Між іншым, «Кошчын дом» з'явіўся па ўсіх правілах тэатральнага праекта: спачатку Оперны абвясціў у сацсетках конкурс фотаздымкаў вусатых-паласатых, у самім тэатры з'явіліся магнікі з персанажамі оперы, а найлепшым сувенірам стала адмысловая праграмка. У буклеце ў выглядзе дамка з праразным акенцам ёсць не толькі інфармацыя пра рэжысёраў і выканаўцаў: некалькі старонак аддадзена пад забаўкі для дзяцей, размалёўку, поле для налепак (якія ідуць тут жа ў камплекце), цікавінкі пра кошак і нават правілы паводзін у выпадку пажару.

Звычайна праграмкі абыходзяцца пералікам дзеючых асобаў, але дзецям яны могуць дапамагчы замагаваць адчуванні пасля прагляду, а ў гэтым выпадку ўражанне, што тэатр — гэта так жа крута, як мультфільмы з растыражаванымі персанажамі-цацкамі.

Прэм'ерны спектакль ад Дар'і Пататурка дорыць надзею, што дзіцячы рэпертуар Вялікага пры новым кіраўніцтве тэатра чакае другое дыханне. Яшчэ нядаўна оперы і балеты для малечы маглі знікаць з рэпертуара на паўгода, і тады малодшых школьнікаў можна было весці хіба што на вечаровы спектакль. Цяпер жа тэатр сядам за «Кошчыным домам» абвяшчае планы на наступную дзіцячую оперу: у другой палове 2020 года на гэтай сцэне павінен з'явіцца «Пінокія» Глорыі Бруні.

**Настасся ПАНКРАТАВА.**

**Фота з сайта Вялікага тэатра.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «ГЗИП», 246050, г. Гомель, ул. Интернациональная, д. 49** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Сооружение специализированное коммунального хозяйства** (очистные сооружения) общ. пл. 146,4 кв. м, инв. № 350/С-135550, по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 49А.
**Составные части и принадлежности**: резервуар дождевых вод, песколовка, здание очистных сооружений.
**Сведения о земельных участках**: 1) предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания очистных сооружений, общ. пл. 0,0172 га; 2) предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания приемного резервуара, общ. пл. 0,0112 га

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 56 588,80 бел. руб.**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 12.03.2020

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**

Начало торгов: **11.00 16.04.2020.**
Окончание торгов: **12.00 16.04.2020.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 14.04.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| Продавец | **ОАО «Полесьеэлектромаш», ул. Красная, 179, 225644, Брестская область, г. Лунинец** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 – капитальное строение, расположенное по адресу:** Брестская обл., г. Лунинец, ул. Красная, 179В

**Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта) общей площадью 867 кв. м, инвентарный номер 133/С-17575. Составные части и принадлежности: забор.
**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 16.08.2065 г. для обслуживания гаража общей площадью 0,5164 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **65 712,00 белорусских рублей (снижение на 50 %)** |

**Лот № 2 – капитальное строение, расположенное по адресу:** Брестская обл., г. Лунинец, ул. Красная, 179Г

**Площадка для хранения материалов** (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 473 кв. м, инвентарный номер 150/С-22101. Составные части и принадлежности: площадка из железобетонных плит, асфальтобетонная площадка, ограждение из бетонных плит на бетонных столбах, ограждение из металлической сетки на металлических столбах, ограждение кирпичное на кирпичных столбах.
**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 16.08.2065 г. для обслуживания капитальных строений: площадка из железобетонных плит, асфальтобетонная площадка, ограждение из бетонных плит на бетонных столбах, ограждение из металлической сетки на металлических столбах, часть ограждения из кирпича на кирпичных столбах общей площадью 0,6382 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **24 024,00 белорусских рублей (снижение на 50 %)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

